скага ўніверсітэта, а з ліпеня 1869 г. пераводзіцца на медыцынскі факультэт Кіеўскага ўніверсітэта. З 1875 г. Судзілоўскі ў эміграцыі ў Лондане, дзе працуе ў шпіталі святога Георгія, сустракаецца з Карлам Марксам. У 1876 г. пад псеўданімам Нікалас Русель прымае ўдзел у красавіцкім паўстанні супраць асманскага валадарства ў Балгарыі. Судзілоўскі насіў новае прозвішча Русель, супрацоўнічаў з вядомым балгарскім рэвалюцыянерам Хрыста Боцевым.

З 1887 г. пераязджае ў Сан-Францыска, дзе меў зносіны і ўзаемадзейнічаў са сваім старым паплечнікам Ягорам Ягоравічам Лазаравым. Пры ўдзеле яшчэ аднаго рускага рэвалюцыянера з Нью-Йорка, Лазара Барысавіча Гольдэнберга, яны актыўна абмяркоўвалі ідэю арганізацыі рэгулярных уцёкаў палітвязняў з Сібіры ў Паўночную Амерыку. Руселю, які ўжо меў да 1891 г. амерыканскі пашпарт, адводзілася важная роля пасярэдніка паміж расійскімі і амерыканскімі ўдзельнікамі аперацыі. Аднак уцёкі з Сібіры наладзіць так і не ўдалося.

У 1892 г. Русель пераязджае на Гавайскія астравы, займаецца медыцынскай практыкай, становіцца адным з заснавальнікаў Гавайскай партыі самакіравання, якая выступае супраць далучэння Гаваяў да ЗША. У 1900 г. Судзілоўскі быў абраны прэзідэнтам Сената Гавайскіх астравоў.

У час руска-японскай вайны вёў актыўную сацыялістычную прапаганду сярод рускіх ваеннапалонных. Выдаваў газету "Расія і Японія". Адным з яго супрацоўнікаў па газеце стаў Аляксей Новікаў-Прыбой, пазней вядомы дзякуючы сваёй кнізе пра Цусімскую бітву [2]. За антыамерыканскую дзейнасць Судзілоўскі быў пазбаўлены амерыканскага грамадзянства.

У 1906–1907 гг. ён шмат працуе над артыкуламі, кнігамі, арганізуе ў Кітаі і ў Японіі выдавецтва. Захапляецца творамі англійскага фантаста Герберта Уэлса з яго тэхнакратычнымі ідэямі. Вядзе перапіску з кітайскім рэвалюцыянерам Сун Ятсенам. Але неўзабаве чарада смерцяў і няшчасцяў сярод блізкіх людзей уводзіць Судзілоўскага ў бездань дэпрэсіі.

Ён губляе веру ў сябе і падумвае пра самагубства. Выратаванне ад цяжкіх думак ён шукае на Філіпінах, якія амаль на пяць гадоў сталі прыстанкам выгнанца з Беларусі. Звычка да актыўнай дзейнасці дапамагае яму аднавіць душэўную раўнавагу.

Ён стварае прыватную лякарню ў Маніле, публікуе артыкулы ў газетах і неўзабаве зноў перасяляецца бліжэй да Расіі, у Нагасакі, потым у кітайскі горад Цяньцзінь [2]. Пасля рэвалюцыі ў Расіі ён усё часцей

задумваецца аб вяртанні на радзіму. Рыхтуючыся да ад’езду, Судзілоўскі нават плануе напісаць што-небудзь для беларускага часопіса “Полымя”, якому некалі абяцаў артыкул. Аднак гэтым планам не наканавана было ажыццявіцца: захварэўшы на запаленне лёгкіх, 30 красавіка 1930 г. Мікалай Канстанцінавіч Судзілоўскі-Русель памёр ва ўзросце 80 гадоў.

За межамі Усходняй Еўропы пра Беларусь мала хто чуў, між тым многія выхадцы з Беларусі і іх нашчадкі, якія эмігравалі ў краіны першага свету, вядомыя ўсёй планеце. Чалавекам-легендай можна назваць Мікалая Канстанцінавіча Судзілоўскага. Як рэвалюцыянер-народнік, ён хадзіў у народ, удзельнічаў у грамадскім руху Швейцарыі, Англіі, ЗША, Францыі, Румыніі, Балгарыі, Японіі і Кітая. Па прафесіі ён быў медык, з яго імем звязаны навуковыя дасягненні ў галіне хірургіі і тэорыі туберкулёзу. За выратаванне сотняў параненых быў узнагароджаны ў Румыніі залатым медалём. Усюды меў славу доктара, які лечыць беднату. Аўтар шматлікіх навуковых прац па медыцыне, хіміі, філасофіі, сацыялогіі і геаграфіі. «Доктар Русель», так яго звычайна называлі, валодаў 10 мовамі, у тым ліку японскай і кітайскай. Ён адкрыў шэраг астравоў цэнтральнай часткі Ціхага акіяна, пакінуў каштоўныя геаграфічныя апісанні Гаваяў і Філіпін. За дасягненні ў галіне этнаграфіі, энтамалогіі, хіміі, біялогіі і аграноміі яму былі прысвоены ганаровыя званні члена Амерыканскага таварыства генетыкаў, навуковых таварystваў Японіі і Кітая. А «Найноўшы філасофскі слоўнік» называе Мікалая Судзілоўскага «першы і апошні энцыклапедыст XX стагоддзя».

ЛІТАРАТУРА

1. Грыцкевіч, В. П. Падарожжы нашых землякоў / В. П. Грыцкевіч. – Мінск, 1968. – С. 141.

2. Іоська. М. І. Мікалай Судзілоўскі-Русель. Жыццё, рэвалюцыйная дзейнасць і светапогляд / М. І. Іоська. – Мінск: Выд-ва БДУ ім. У. І. Леніна, 1976.

УДК 904(476):666.1”17”

– студэнт

-

*Навуковы кіраўнік* – ***Курловіч-Бляяўская П. С.*** *– магістр гіст. навук, выкладчык*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
Мінск, Рэспубліка Беларусь

Шкларобчая майстэрня (гута) у вёсцы Ілья Вілейскага раёна – археалагічны помнік другой паловы XVIII – пачатку XIX стст. Дадзены помнік стаў мэтанакіравана даследавацца толькі ў апошнія гады, хаця і вядомы з 1980-х гг., калі тут праводзіў раскопкі М. М. Чарняўскі [5, с. 375–376]. Былі знойдзены рэшткі печаў, аскепкі шклянога посуду, шкламаса, аскепкі гліняных варніц і іншага керамічнага посуду. Матэрыялы раскопак былі перададзены ў Мінскі абласны краязнаўчы музей у Маладзечна, дзе захоўваюцца дагэтуль [4, с. 146]. Існуюць звесткі, што даследаваннем помніка займаўся таксама З. С. Пазняк, але дакументальнага падцверджання гэтаму няма [2, с. 5].

Першая ўзгадка гуты належыць да 1772 г. [1, с. 50]. Яе заснавалі графы Салагубы, якія валодалі Ільяй [3, с. 89]. У 1794 г., пасля разгрому паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, яна была перададзена графу Салтыкову, які ў 1806 г. прадаў яе памешчыку Валадковічу [3, с. 89]. З-за недахопу сыравіны вытворчасць шкла спынілася ў 1806 г. [3, с. 89]. Але ў 1815 г. яна была адноўлена ў маёнтку Старажыслаў [3, с. 89] (сучасная вёска Новая Гута). У 1828 г. яе атрымаў у спадчыну памешчык Радзішэўскі [3, с. 89]. У 1833 г. вытворчасцю валодала памешчыца Макля Гутнерава [6, с. 141]. Гута існавала да 1890-х гг., калі шкло пачалі вырабляць на заводзе ў сучасным пасёлку Партызанскі [6, с. 140]. У розныя гады вытворчасць шкла мела розныя памеры. Так, у 1828 г. было выраблена 2015 адзінак вырабаў, працавала 26 чалавек, якія былі прыгоннымі [3, с. 89–90], а ў 1897 г. на створаным шклозаводзе працавала ўжо 120 рабочых, а аб’ём вырабаў дасягаў сарака тысяч рублёў у год [6, с. 140].

Сучасныя раскопкі помніка праводзіліся ў 2015–2016 гг. пад кіраўніцтвам П. С. Курловіч-Бляяўскай. На перыферыі і вытворчай пляцоўцы былі шматлікія артэфакты. Керамічны комплекс прадстаўлены аскепкамі цэглы, посуду, адзінкавымі фрагментамі кафлі. Выяўленыя падчас раскопак шкляныя вырабы адносяцца да

розных тыпаў – гэта і сталовы, і тарны, і аптэчны посуд розных колераў, а таксама аконнае шкло. Акрамя фрагментаў вырабаў, у склад археалагічнай калекцыі патрапіла вялізная колькасць самых разнастайных адыходаў вытворчасці.

Унікальнасць рэчавага комплексу заключаецца ў яго вузкай храналогіі (другая палова XVIII – пачатак XIX стст.) [2, с. 18]. Даціроўка археалагічнага помніка пацвярджаецца выяўленымі пры раскопках манетамі, якія былі адчаканены з 1730-х па 1792 гг. [2, с. 15].

У святле атрыманых фактаў перспектыўным рашэннем прадстаўляецца музеефікацыя Ільянскай гуты. Прыкладам падобнага могуць паслужыць польскія майстэрні шкла: у Строне Шлёнскім (гута “Віялета”) [7], у Шклянай Парэбе (сляды вытворчасці прасочваюцца з XIV ст.) [8], а таксама шэраг іншых падобных майстэрняў. Магчыма прапанаваць некалькі накірункаў у вырашэнні дадзенага пытання:

- правесці кансервацыю археалагічнага помніка;
- стварыць музей, дзе будуць выстаўлены артэфакты, якія былі знойдзены падчас раскопак, і экспазіцыю на адкрытай прасторы, дзе будзе прадстаўлена адноўленая працоўная пляцоўка гуты;
- па магчымасці аднавіць вытворчасць шкла па тэхналогіях XVIII ст. Шкляныя вырабы такога кшталту будуць мець значную калекцыйную вартасць;
- для рэпрэзентацыі музея стварыць азнаямляльныя анлайн-экскурсіі па экспазіцыі і па працоўнай пляцоўцы;
- пажадана дадзеную музеефікаваную гуту ўвесці ў комплекс адноўленага мястэчка XVIII ст. Такім чынам, уся вёска Ілья пераўтвараецца ў своеасаблівы музейны комплекс, адной з асноўных частак якога будзе Ільянская гута.

Мерапрыемствы па музеефікацыі Ільянскай гуты паспрыяюць развіццю турызму на Вілейшчыне, захаванню ўнікальнага помніка археалогіі XVIII ст. Магчыма, што ў выніку вырашэння дадзенага пытання будуць прыцягнуты інвестыцыі, атрыманыя ў выніку гэтага сродкі можна будзе выкарыстаць для развіцця Вілейскага рэгіёну і яго інфраструктуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Жаврид, М. Ф. Белорусское стекло / М. Ф. Жаврид. – Минск: Наука и техника, 1969. – 192 с.

2. Курловіч-Бяляўская, П. С. Справаздача аб археалагічных раскопках Ільянскай гуты ў ваколіцах вёсак Ілья і Старая Гута Вілейскага раёна Мінскай вобласці ў 2015 г. / П. С. Курловіч-Бяляўская / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх №. 3319.

3. Состояніе фабрик и заводовъ въ 1828 году въ Минской губерніи // Журнал мануфактуръ и торговли. – 1831. – № 9. – С. 88–90.
4. Чарняўскі, М. М. Рэшткі шкляной мануфактуры / М. М. Чарняўскі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. – Мінск: БелСЭ, 1987. – С. 146.
5. Чернявский, М. М. Раскопки в бассейнах Немана и Вилии / М. М. Чернявский // Археологические открытия 1982 года / Ин-т археологии АН СССР: Наука; под науч. ред. Б. А. Рыбакова. – М., 1984. – С. 375–376.
6. Яніцкая, М. М. Беларускае мастацкае шкло / М. М. Яніцкая. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 143 с.
7. Huta Szkła Kryształowego [Электронны рэсурс] // Huta Szkła Kryształowego „Violetta”. – Рэжым доступу: http://violetta.com.pl/violetta-historia/. – Дата доступу: 26.04.2017.
8. Lesna Huta [Электронны рэсурс] // Lesna Huta. Wielowiekowe tradycje hutnictwa szkła w Szklarskiej Porębie. – Рэжым доступу: http://www.lesnahuta.pl/historia-hutnictwa.html. – Дата доступу: 26.04.2017.

УДК 821.161.3

– студэнтка
-
*Навуковы кіраўнік – **Малько Г. І.** – канд. філал. навук, дацэнт*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Многія даследчыкі ўказваюць, што ў светапоглядзе Ф. Скарыны дамінуе этычны аспект. І гэта не выпадкова. Спрадвеку на беларускіх землях культура развівалася ў такім кірунку. Выхаванне прыстойнай, цнатлівай асобы было заўсёды клопатам нашых продкаў. Скарына спрабаваў уводзіць у этычныя пошукі свецкія, жыццесцвярджальныя пачаткі, хрысціянскія духоўныя каштоўнасці ўхваляў на канкрэтных жыццёвых прыкладах.

Многія сярэднявечныя багасловы прадпісвалі чалавеку на зямлі быць цярплівым, пакорлівым, сваім аскетызмам здабываць сабе лепшую долю на тым свеце. Зямное жыццё пры гэтым разглядалася толькі як часовае, неістотнае ў параўнанні з вечным, замагільным. На такіх поглядах грунтавалася ўся сістэма маральнага выхавання, якую Ф. Скарына прыняць не мог. Ён арыентуе людзей і на рэальнасць жыцця і даводзіць, што дабрачынныя паводзіны самі па сабе з’яўляюцца найвышэйшай узнагародай для душы чалавека.

Характэрна, што ў арганізацыі шчаслівага жыцця, на думку Скарыны, многае залежыць ад самога чалавека, які можа і нават павінен удасканальваць сваю прыроду. Прычым мысліцель неаднаразова падкрэсліваў, што для станаўлення асобы вызначальным

з'яўляецца фармаванне духоўнага свету індывіда. Менавіта таму і здзейсніў ён выданне для ўсіх людзей тых біблейскіх кніг, змест якіх павінен павучаць людзей, удасканальваць іх.

Паводле поглядаў Скарыны, маральна ідэальны той чалавек, які дасканалы інтэлектуальна і маральна ды яшчэ і асветлены высокай духоўнасцю. Скарына даволі прагрэсіўна для свайго часу вырашыў пытанне аб спалучэнні інтарэсаў грамадства і асобы. Як і патрабуе хрысціянская этыка, ён без усялякіх ваганняў ставіць грамадскае вышэй за асабістае. Аднак мысліцель не адкідваў інтарэсаў канкрэтнай асобы і спрабаваў сумясціць арыентацыю індывіда на справы "агульнага дабра", карысныя для ўсіх, з яго жаданнем асабістага шчасця. Францішак Скарына жадаў, каб кожны чалавек і ўсе людзі "добре жілі на свете".

Скарына наблізіўся да разумення таго, што чалавечая мараль бярэ пачатак унутры самога чалавека, у яго сэрцы, у той час як асноўныя хрысціянскія дактрыны сярэднявечча вытлумачвалі мараль як нешта знешняе, фармальнае, навязанае чалавеку.

На адно з першых месцаў у новай сістэме дабрачыннасцяў Скарына выводзіць чалавекалюбства. У той жа час мысліцель-педагог разумеў, што навучыцца любіць усіх немагчыма без любові да свайго народа, да сваёй Радзімы. Скарыназнаўцы сцвярджаюць, што само паняцце "айчына" як філасофска-этычная катэгорыя было ўпершыню ўведзена ў грамадска-педагагічны ўжытак на Беларусі вялікім палачанінам. Вытокі "любві отчіны" Ф. Скарына ілюструе хрэстаматыйным выказваннем, у якім даволі трапна і вобразна тлумачыцца, чаму людзі "ігде зродиліся і ускормлены суть по бозе, к тому месту велікую ласку імають".

Скарына гаворыць пра выхаванне такіх маральных якасцей, як праўдзівасць, сумленнасць, шчодрасць, міласэрнасць, спагадлівасць, дабрыня, сціпласць, мужнасць і інш. "Добрые нравы", на думку Скарыны, пашыраюцца, калі дзеці навучаны любіць сваіх бацькоў, клапаціцца пра іх.

Набліжэнне эпохі дзелавых, энергічных людзей (капіталізму) выклікала ў грамадстве патрэбу асабліва ўзвысіць працавітасць – маральную якасць, якая ў пашане ў народнай педагогіцы беларусаў, у хрысціянстве. Як прыклад таго, што любоў да працы робіць гонар і мужыку, і пану, філасоф прыводзіць тыя краіны з біблейскіх сюжэтаў, дзе "мнозі царі со труженіем поживше".

Беларускі мысліцель раскрываў сутнасць не толькі станоўчых маральных якасцяў, што павінны быць уласцівы кожнаму чалавеку, але і адмоўных рысаў. Адмоўнае, ліхое, што ёсць у чалавеку ці грамадстве, не дазваляе дасягаць духоўных вяршыняў, але ж і з'яўляецца тымі прыступкамі, пераадоленне якіх маральна гартуе як асобу, так і грамадства ў цэлым. Вялікая заслуга Францішка Скарыны ў тым, што многія маральныя каштоўнасці ён пераасэнсаваў на гуманістычна-дэмакратычны лад, іншыя ж напоўніў новым зместам, надаў ім агульначалавечы характар.

Францыск Скарына ў сваёй творчасці імкнуўся выявіць шляхі "навченія добронравію". У якасці галоўнага шляху ў арганізацыі маральнага выхавання мысліцель называе асвету людзей. Асновай для засваення добрых нораваў і звычаяў ён лічыць веды і розум. Найважнейшым сродкам для набыцця мудрасці Францыск Скарына лічыў кнігу, з якой і дзеці, і дарослыя могуць чэрпаць "добрые нравы, яко бы со істочніка". Свяшчэннае пісанне, паводле першадрукара, – найважнейшая крыніца маральных нормаў і сродак маральна-духоўнага выхавання. Выхаваўча-прагматычныя матывы чуюцца ў радках мысліцеля з паўторам думкі Цыцэрона аб тым, што дом, у якім няма кнігі, падобны на цела, якое пазбаўлена душы.

Францыск Скарына скіроўваў сваіх чытачоў на напружанне ўласных сіл дзеля свайго духоўнага развіцця, раскрываў выключную ролю самавыхавання ў гэтым працэсе. Асветнік быў упэўнены, што маральнае ўдасканаленне асобы пачынаецца з пазнання чалавекам свайго ўнутранага свету. Высока цаніў Францыск Скарына і сілу ўласнага прыкладу. Загаданыя ім вобразы біблейскіх герояў, як ён меркаваў, павінны стаць добрым прыкладам для людзей у працэсе іх маральнага ўдасканалення.

Пры распрацоўцы шляхоў набыцця высокіх маральных рысаў і якасцяў чалавекам асветнік аддае належнае розуму, але і прызнае значны ўплыў на паводзіны асобы, яе ўчынкі чалавечых пачуццяў. Скарына падкрэслівае, што менавіта праз сэрца праходзіць шлях да маральнага ўдасканалення. Вось чаму асветнік абгрунтоўвае думку, што мастацтва не толькі прыносіць эстэтычную асалоду, але і дапамагае чалавеку стаць гуманным чалавекам. Прыгожае Скарына атаясамлівае з маральнымі дабрачыннасцямі, і, наадварот, зло і амаральнасць як бы стаяць у адным шэрагу з паняццямі "агідны, брыдкі" і г. д.

Этыка-педагагічныя ідэі знакамітага вучонага адпавядалі духу Адраджэння, таму і знаходзілі водгук як на Радзіме мысліцеля, так і за яе межамі. І ў наступныя эпохі да духоўнай спадчыны першадрукара звярталіся тыя, хто шукаў шляхі да больш дасканалай арганізацыі жыцця, імкнуўся ўзвысіцца духоўна. А сёння, калі наша грамадства робіць своеасаблівую “рэвізію” маральных каштоўнасцяў, маральна-выхаваўчыя ідэі вялікага земляка зноў захапляюць нас сваей моцай і значнасцю.

ЛІТАРАТУРА

1. Падокшын, С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С. А. Падокшын. – Мінск, 1990.

2. Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. даведнік. – Мінск, 1988.

УДК 882.6-8 +882.6.09

ў – студэнт

*Навуковы кіраўнік* – ***Гусарава Г. А.*** *– канд. гіст. навук, дацэнт*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Прадвеснікамі беларускага адраджэння першай паловы XIX ст. сталі філаматы, сярод якіх былі Ян Чачот, Ігнат Дамейка, Адам Міцкевіч, Ануфрый Петрашкевіч, Аляксандр Ходзька і інш.

Галоўнай мэтай філаматы лічылі падрыхтоўку моладзі да рознабаковай дзейнасці на карысць Айчыны. Яна ажыццяўлялася ў навуковым і арганізацыйным кірунках, ва ўласнай творчасці, прадугледжвала глыбокае авалоданне разнастайнымі навуковымі ведамі. Вялікая ўвага аддавалася абуджэнню нацыянальнай свядомасці, прапагандзе гуманізму, галоўная роля пры гэтым адводзілася гуманітарным навукам. Філаматы трактавалі веды і навуку каштоўнасцямі чалавека, выступалі супраць спроб абмежавання культурна-асветніцкіх функцый навукі і адукацыі.

Вырашэнне галоўных грамадска-палітычных праблем філаматы разглядалі як залежнае ад палітычнай улады і суадносілі яго з вырашэннем маральных праблем; маральнае зло лічылі асновай любой несправядлівасці сацыяльнага жыцця. Яны збіралі і аналізавалі беларускі літаратурны фальклор, звычаі і абрады, планавалі падрыхтаваць сінтэзаваную характарыстыку народнага жыцця.

Філаматы стварылі шэраг саюзаў-клубаў з мэтаю пашырэння свайго ўплыву на моладзь і павышэння ўзроўню самаарганізацыі: “Саюз сяброў” (1819), “Саюз філарэтаў” і “Саюз прамяністых” (1820).

Адным з самых актыўных сяброў Таварыства філаматаў, агульнапрызнаным яго “дударом” стаў Ян Чачот. Ён цалкам падзяляў філамацкія ідэі, развіваў і пашыраў іх разам з сябрамі на практыцы, што праявілася ў яго творчым паглыбленні ў вуснапаэтычную творчасць свайго народа і асабліва ў спробе стварыць беларускую літаратуру.

Першыя вядомыя літаратурныя творы Яна Чачота з’явіліся недзе каля 1818 г. і былі звязаны з жыццём філаматаў. Песні і вершы да студэнцкіх урачыстасцей пісалі разам з ім Адам Міцкевіч, Тамаш Зан і інш., але, як заўважаюць польскія біёграфы паэта, якраз вершы і песні Яна з Мышы мелі найбольшую папулярнасць сярод студэнтаў, бо ў іх ярчэй адбіліся антыўрадавыя настроі моладзі, вольналюбівыя ідэі аўтара. Самы вялікі поспех у моладзі, якая паходзіла з беларускай шляхты, мелі тыя філамацкія творы Яна Чачота, якія былі напісаны па-беларуску.

…Падрастай, народ маленькі,
Гаспадынькі, аратаі.
Адарыць мне вас няма чым –
Шчырым сэрцам адараю… [2].

Шмат зрабіў Ян Чачот і ў беларускай фалькларыстыцы. Гэта быў сапраўдны подзвіг паэта, які здолеў на працягу 1837–1846 гг. сабраць і выдаць у шасці зборніках беларускія народныя песні “з-пад Нёмана і Дзвіны”, а таксама творы іншых жанраў фальклору. Гэтымі зборнікамі ён паказваў свету, якія неацэнныя скарбы мае беларускі народ.

Актыўнымі дзеячамі беларускай культуры, якія падзялялі погляды Яна Чачота, былі Адам Міцкевіч і Ігнат Дамейка.

У сваёй паэзіі Адам Міцкевіч стварыў вобраз Радзімы ў самым высокім патрыятычным сэнсе. Ён апеў і ўславіў родны кут, дарагія сэрцу краявіды і вобразы, па сутнасці, стварыў культ беларускага пейзажу і прыроды бацькоўскага краю.

…Гушчар лесу пахне чаборам і мёдам,
Жывіцы настоем смалістым.
Там возера Свіцязь, як шыбіна лёду,
Ляжыць паміж дрэваў цяністых… [1].

Ужо ў ранняй “філамацкай” творчасці Адама Міцкевіча знайшлі адлюстраванне яго грамадска-палітычныя погляды на гісторыю і лёс

роднага краю, ролю нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў гістарычным працэсе. У паэме “Мешка, князь Навагрудка” (1822) створаны рамантычны вобраз жанчыны-патрыёткі і ваяводы Парая, гатовых на самаахвярнае змаганне дзеля вызвалення Айчыны. Гэта стала асноўнай тэмай усёй яго творчасці.

Многія творы Міцкевіча сталі агульнапрынятымі сімваламі вызваленчага руху на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. Вершы ковенскага перыяду (1819–1823) “Песня Адама”, “Песня філарэтаў”, “Ода да маладосці” сталі агульнапрызнанымі сімваламі філамацкага руху, кодэксам паводзін яго членаў, спалучаліся з роздумам паэта пра лёс усяго чалавецтва.

Галоўным творам А. Міцкевіча стала паэма “Пан Тадэвуш”, якую нашчадкі назвалі “энцыклапедыяй жыцця ліцвінаў”. Прадчуванні і спадзяванні на вызваленне Айчыны з няволі, душэўны ўздым, учынкі і памкненні герояў выяўляюць патрыятычны пафас твора, напаўняюць яго нацыянальна-вызваленчымі матывамі. Патрыятызм твора і настальгія аўтара па Айчыне выявіліся і ў палемічнай абароне глыбіннага хараства ўсяго роднага, нацыянальнага, мясцовага (прыроды, адзення, побыту, звычаяў, тыпу паводзін).

Мастацкая спадчына Адама Міцкевіча завяршаецца невялікім цыклам «лазанскай» лірыкі (“Над вадою вялікай і чыстай”, “Паліліся мае слёзы” і інш.), дзе ў філасофска-элегічным ключы выяўлены матывы настальгічнага смутку і выгнанніцтва. Выхаваўчае і пазнавальнае значэнне мелі яго лекцыі па гісторыі славянскіх літаратур.

Сярод тых, хто актыўна падтрымліваў ідэі філаматаў, ілюстраваў кнігі А. Міцкевіча, быў Ігнат Дамейка. Пакінуўшы Беларусь пасля забароны таварыства філаматаў, ён апынуўся на тэрыторыі Лацінскай Амерыкі, у Чылі. Там ён адкрыў універсітэт, арганізаваў метэаралагічную службу, займаўся мінералагічнымі даследаваннямі, вывучаў знойдзены ў пустыні Атакама метэарыт, вывучаў жыццё абарыгенаў Паўднёвай Амерыкі. У гарах Кардыльерах адкрыў паклады невядомага навуцы альгамату серабра – аркерату, арганізаваў золатаздабычу і здабычу селітры. Яго вучань Ніколас Нарньё знайшоў багатую сярэбраную жылу, якую назваў імем свайго настаўніка – “Міна дэ Дамейка”. Удзячныя чылійцы паставілі помнік І. Дамейку, на якім напісалі “Великому просветителю” [3, с. 408].

Дзейнасць філаматаў і філарэтаў – тайных студэнцкіх таварыстваў – з’яўляецца важнай старонкай у гісторыі беларускага

нацыянальнага адраджэння. Гэта былі таленавітыя, рамантычна ўзнёслыя юнакі, бязмерна адданыя сваёй Айчыне, ахопленыя прагай да асветы, вяртання да гістарычна-культурных традыцый беларускага народа.

ЛІТАРАТУРА

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 5. М – Пуд / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1999. – 592 с.: іл.
2. Літаратура Беларусі XIX стагоддзя: анталогія / укладальнікі: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2013.
3. Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Энцыкл. даведнік / Беларус. Энцыкл.; гал.рэд. "Беларус. Энцыкл.": Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1995. – 671 с.

УДК 394.26(476.5)
. – студентка

**« »:**

*Научный руководитель – **Киселёв А. В.** – преподаватель*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»,
Горки, Республика Беларусь

В 1988 г. в Витебске был сдан в эксплуатацию Летний амфитеатр с самой большой в стране сценой и залом на 5,4 тыс. мест. Витебский Летний амфитеатр является уникальной для Беларуси концертной площадкой, где ежегодно проходит один из популярнейших на постсоветском пространстве музыкальных фестивалей «Славянский базар» [1].

Свою историю фестиваль «Славянский базар» ведет с 18 июля 1992 г. У истоков мероприятия стояли три государства – Россия, Беларусь и Украина. В первый год организаторы преследовали довольно скромные цели – ознакомить витебского зрителя с песенным творчеством славянских стран. Опыт первого «Славянского базара» показал, что интерес к этому творчеству велик и что фестивальные рамки должны охватывать не только песенное искусство. Программа фестиваля традиционно включает Международный конкурс молодых исполнителей эстрадной песни; Международный детский музыкальный конкурс; гала-концерты мастеров искусств Беларуси, России и Украины; концертные программы «звезд» эстрады и др. С 2016 г. в программу «Славянского базара в Витебске» были включены спортивные состя-

зания, театральные постановки. Фестивальным девизом является: «Через искусство – к миру и взаимопониманию!»

С 1993 г. музыкальный конкурс «Славянский базар» является членом Международной федерации организаторов фестивалей (FIDOF). На флагштоке фестиваля в 1993 г. впервые появились флаги Болгарии, Киргизии, Литвы, Словакии, Турции, Югославии. В 1994 г. впервые на фестивале в здании Белорусского государственного академического драматического театра им. Я. Коласа открылся Центр национальных культур. Именно там состоялись концерты национальных делегаций, мероприятия, посвященные Дням культуры Беларуси, России, Украины, Болгарии, Польши.

С 1995 г. «Славянский базар» стал называться Международным фестивалем искусств. Впервые в его рамках демонстрировалась большая программа фильмов славянского кино, посвященная вековому юбилею мирового кинематографа. Впервые на фестиваль приехали представители Кипра, Нидерландов, Греции, Узбекистана и Швейцарии.

В 1998 г. фестиваль в Витебске – межгосударственный культурный проект Союза России и Беларуси. С этого года Международный фестиваль искусств стал называться «Славянский базар в Витебске». Само название подчеркивает его принадлежность витебской земле. Концепция фестиваля 1999 г. отражала тему упрочения Союза Беларуси и России. День Беларуси на «Славянском базаре в Витебске» стал одновременно и торжеством открытия праздника, а День России – его завершением [3].

В 2000 г. на «Славянский базар в Витебске» съехались представители всех славянских народов, живущих на Земле. Впервые на фестивале состоялся концерт авторской песни. Географические рамки проекта постоянно расширялись. Витебск посетили артисты из всех частей света.

С 2003 по 2007 гг. в фестивальном Витебске к песенному конкурсу вокалистов добавились новые мероприятия. На XII фестивале искусств впервые был проведен День Союзного государства. С тех пор он стал традиционным. Тогда же впервые прошел Праздник славянской поэзии, организованный по инициативе группы белорусских авторов. В рамках «Славянского базара» прошел первый Международный детский музыкальный конкурс.

Зародилась на фестивале и еще одна традиция: впервые его программа вышла за рамки Витебска. Концерты гостей и участников этого праздника искусств прошли во всех областных центрах и в Минске.

В рамках Международного фестиваля искусств «Славянский базар в Витебске» была положена традиция международных молодежных форумов, в которых к 2017 г. приняли участие представители молодежных организаций из двадцати девяти стран. Важной особенностью 2006 г. стало то, что одновременно с юбилеем Международного фестиваля искусств «Славянский базар в Витебске» праздновалось пятнадцатилетие независимых государств Беларуси, России и Украины.

Попытка внести изменения была предпринята на XXII Международном фестивале искусств. Вместо отдельных концертов стран – учредителей фестиваля – состоялся «Концерт дружбы. Союзное государство приглашает». Однако в дальнейшем от такой практики отказались. Фестивальным летом 2013 г. акценты были сдвинуты на музыкальные конкурсы, а каждый из праздничных дней стал более насыщенным. Форум искусств сократился с семи дней до пяти, однако по информационному объему не уступал предыдущим праздникам.

Рекордным стал XXV фестиваль по числу зрителей. В один концертный день на главной сценической площадке города в Летнем амфитеатре 13 июля 2016 г. с аншлагом прошли три концерта: «Привет из Сан-Ремо» – итальянских исполнителей, группы «Руки вверх» с участием белорусского коллектива «Без билета» и первый день Международного конкурса исполнителей эстрадной песни «Витебск-2016», которые собрали 18 тыс. зрителей.

«Славянский базар в Витебске» – одна из реклам Беларуси как туристического центра. И обидно превращать ее в телерекламу, чтобы жители других стран узнавали о нас только благодаря трансляциям одних лишь концертов из Летнего амфитеатра. История Витебска и его насыщенная культурная жизнь (кроме «Базара», здесь проходят другие международные фестивали (праздник детского творчества, конкурс «Рождественский фейерверк») достойны того, чтобы в город на Двине приезжали туристы.

ЛИТЕРАТУРА

1. Котлярова, Ж Н. Славянского базара синеет василек / Ж. Н. Котлярова // Белорусская думка. – 2014. – № 4.– С. 36–42.

2. Жалельщикова, Е. А. Наш славянский базар / Е. А. Жалельщикова // Вестник академии искусств. – 2017. – № 3. – С. 41–47.

3. Фестиваль искусств «Славянский базар»: традиции и история [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ria.ru/spravka. – Дата доступа: 05.04.2017.

УДК 130.2(09)

– студентка

*Научный руководитель – **Гусарова Г. А.** – канд. ист. наук, доцент*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»,
Горки, Республика Беларусь

Симеон Полоцкий является одним из выдающихся деятелей не только белорусской и русской, но и, более того, славянской культуры в целом. Он вошел в историю как монах, общественный и церковный деятель, богослов, педагог и воспитатель, поэт и писатель. По разносторонности своих интересов и деятельности был близок деятелям эпохи Возрождения.

Симеон Полоцкий (Самуил Петровский-Ситнянович) родился в Полоцке в 1629 г. В 1651 г. он окончил Киево-Могилянскую коллегию крупнейшего тогда православного центра высшего гуманитарного и богословского образования, а в 1653 г. – Виленскую иезуитскую академию. Вернувшись в Полоцк, в июне 1656 г. в Богоявленском монастыре принимает монашество с именем Симеона и получает должность «дидаскала» – учителя в «братской» школе при том же монастыре.

Его усилиями в Полоцкой братской школе была значительно расширена программа обучения: в дополнение к белорусскому языку включались для изучения русский и польский, большее внимание уделялось грамматике, осваивались риторика и поэзия. В 1660 г. вместе с учениками своей братской школы Симеон Полоцкий на несколько месяцев уезжает в Москву, где ему удалось побывать в царском дворце в Кремле и читать свои стихи высочайшему семейству. В 1661 г. он навсегда переехал в Москву, поселился в Спасском монастыре и получил место учителя латинского языка в монастырской школе. Симеон Полоцкий привез с собой плоды европейской учености – прекрасное знание языков: латинского, польского, белорусского, украинского, а также «семи свободных наук» – грамматики, риторики, диалектики, арифметики, геометрии, астрологии, музыки.

Широкая образованность Симеона, его литературные таланты побудили царя Алексея Михайловича пригласить его в 1667 г. в наставники к наследнику престола царевичу Алексею, а после смерти Алексея – к царевичу Федору. Приглашение ко двору в качестве домашнего учителя царских детей окончательно упрочило положение Симеона в

придворных кругах. Он становится одним из влиятельнейших людей при дворе Алексея Михайловича, а после его смерти и при дворе своего ученика царя Федора Алексеевича [1].

Для царских детей Симеон Полоцкий написал несколько сочинений: «Вертоград многоцветный», «Житие и учение Христа, Господа и Бога нашего» и ряд других. Он составлял также речи царя, писал торжественные объявления. В 1678 г., пользуясь покровительством царя Федора, Симеон Полоцкий открыл в Кремле типографию, где издавал сочинения свои и других авторов, привлекая к оформлению книг придворного художника Симона Ушакова и гравера Оружейной палаты Афанасия Трухменского. Симеон издал в типографии «Букварь языка славенска» (1679), «Тестамент Василия, царя греческого, сыну Льву» (1680), «Историю о Варлааме и Иоасафе» (1680).

Одной из главных в своей деятельности Симеон Полоцкий считал проповедническую. Им было написано более 200 проповедей, которые составили сборники «Вечеря душевная» и «Обед душевный», изданные уже после смерти их автора. Стиль проповедей у Симеона Полоцкого достаточно прост, чужд вычурности. Сухим абстракциям, особенно затруднительным для понимания на слух, Полоцкий предпочитает описания и рассказы, которые наглядно представляют мысль и сообщают проповеди художественную изобразительность. Талантливый проповедник, ученый-полемист и богослов, переводчик и педагог, Симеон Полоцкий вошел в историю и как литератор, драматург, поэт, основоположник русской силлабической поэзии.

Писал он преимущественно по-белорусски, книжным торжественным стилем, приближенным к церковнославянскому языку. Характерные черты его поэтических произведений полоцкого периода – патриотизм, любовь и почет к своему народу, к родному городу и стране. Среди произведений на эту тему элегическая молитва «Пролог к преподобной матери Ефросинье» о забирании чудотворной иконы Богородицы из Полоцка в Москву, в которых поэт просит святую покровительницу Беларуси помочь вернуть «в страну Полоцкую» народную святыню.

Убо, о мати, припади за нами
К господу Богу твоими рабами,
Да возвратит нам икону святую,
Просвети землю белороссийскую [2].

Сочинительство стихов было одним из любимых его занятий. Поэтическое наследство Симеона Полоцкого огромно. Общее количество

стихотворных строк, написанных им за все годы его литературной деятельности, достигает пятидесяти тысяч. Поэзию он сравнивал с красивым садом, философию – с пчелой, что собирает «мед мудрости». Красота церковного искусства необходима для морального воспитания, ведь через его воздействие на души людей происходит вытеснение отрицательных аффектов положительными чувствами: через красоту музыки и слова недовольные становятся терпеливыми, ленивые – трудолюбивыми, неразумные – мудрыми, блудные – чистыми сердцем. Незадолго до своей смерти, в 1678 г., Симеон все свои стихи, «в различная лета и времена сложенныя», объединил в два обширных сборника – «Рифмологион» и «Вертоград многоцветный». Оба сборника представляют первостепенный интерес для характеристики Симеона Полоцкого как поэта.

Писал Симеон Полоцкий и драматургические сочинения. Первые его опыты в этом жанре относятся еще к тому времени, когда он был учителем «братской» школы в Полоцке. Для учащихся этой школы он около 1658 г. написал небольшую рождественскую пастораль под заглавием «Беседы пастушеские», которая под его руководством и была исполнена учащимися. В дальнейшем в Москве появились новые его произведения. От этого времени дошли до нас две его пьесы в стихах: «Комедия о Навуходоносоре царе, о теле злате и о триех отроцех в пещи не сожженных» и «Комедия притчи о блудном сыне», а также более двадцати так называемых «декламаций» [3].

Просодическая структура силлабической поэтики, которая основывалась на безударном вокализме, перешла в «поэтический сад» Симеона Полоцкого из традиционной античной, фольклорной и литургическо-христианской песенно-поэтической культуры. На ее основе поэт стремился привить белорусской и российской литературе светский поэтический профессионализм.

ЛИТЕРАТУРА

1. Асветнікі зямлі Беларускай: X – пачатак XX ст. Энцыкл. даведнік / Г. П. Пашкоў [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2006. – 496 с.

2. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. даведнік / Беларус. Энкцыкл.; гал. рэд. "Беларус. Энкцыкл.": Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1995. – 671 с.

3. Мяснікоў, А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А. Ф. Мяснікоў. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Литература и искусство, 2009. – 344 с.

УДК 347.782

. – студентка

*Научный руководитель – **Марченко Т. Н.** – канд. ист. наук, доцент*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»,
Горки, Республика Беларусь

Два года назад в Лондоне, в знаменитой картинной галерее Саатчи, проходила грандиозная выставка, посвящённая 70-летию Победы над фашизмом. Открывалась экспозиция огромным полотном Мая Данцига «И помнит мир спасенный». Ещё одну его картину, «Партизанская баллада», не взяли на республиканскую выставку – «завернули»... Прошло почти полвека, и она триумфально была показана в Лондоне. Май Данциг со своими двумя полотнами оказался единственным белорусским художником, кто удостоился подобной чести. Почти каждая его значительная работа вызывала противоречивые чувства. От полного восторга до резкого неприятия. Но проходило время, и всё становилось на свои места [1].

В марте 2017 г. на 87 году жизни народный художник Беларуси скончался. Шестьдесят лет он служил искусству, воспитывал молодёжь, передавая знания и опыт. Он стал эпохой, а его работы уже давно считаются классикой.

Май Вольфович родился 27 апреля 1930 г. в Минске. В 1952 г. он окончил Минское художественное училище, а в 1958 г. – Московский художественный институт имени Сурикова. В изобразительное искусство Данциг пришел в 50–60-е гг. минувшего столетия, став мэтром популярного тогда «сурового стиля». М. Данциг посвящал свои картины социально важным темам, занимался в основном станковой и монументальной живописью [2].

Родной город художника был его самым любимым местом. Май Данциг с этюдником исходил Минск вдоль и поперек, делая зарисовки, наброски. Среди работ послевоенного периода – «Весна 1944», «Март», «На бульваре», «Растут новые кварталы», «Минск пробуждается», «Верхний город» и др. И его удачная проба пера совершилась. Он изобразил город во всех ярких красках, тем самым показал бунтарскую молодость.

Май Данциг был оптимистом, любил жизнь и сильно благодарил родителей за поддержку. Он часто вспоминал, что во времена студен-

ческой жизни мама ему присылала 30 рублей. Деньги он тратил на кисти и альбомы, и денег не оставалось даже на проезд на трамвае.

Удивительно, но художник создал значительные произведения во всех жанрах, за которые брался. Написал знаковые пейзажи родного Минска. Те, что сегодня являются его визитной карточкой, по которым безошибочно узнаётся наша столица: «Мой Минск» (1967), «Мой город древний, молодой» (1972).

Помимо изображений родного Минска, он написал большие жанровые картины, посвящённые Великой Отечественной войне: «Беларусь – мать партизанская» (1967), «Партизанская свадьба» (1968), «Партизанская баллада» (1969). Эти картины насыщены оригинальностью, своеобразным сюжетом. Им были созданы портреты современников и великолепные натюрморты. В его станково-монументальных полотнах органично сочетаются элементы символики и пластическая выразительность реалистического образа.

В его мастерской насчитывается около двухсот работ, в экспозициях находится более трёхсот картин, этюдов, набросков. Многие полотна хранятся в Третьяковской галерее, национальных музеях Украины, России, Азербайджана, Армении, в частных коллекциях в Америке, Франции, Германии, Израиле.

Май Данциг был целеустремлённым человеком. Художник считал, что нужно идти к своей цели не маленькими «переулками», а главной улицей и главной дорогой, не отходя от ранее намеченного пути, быть ему верным, потому что искусство не терпит измены. И этот путь народный художник Беларуси честно прошёл от начала до конца.

ЛИТЕРАТУРА

1. Вечный Май [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/vechnyy-may.html. – Дата доступа: 01.05.2017.

2. Умер народный художник [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/umer-narodnyy-khudozhnik-belarusi-may-dantsig.html. – Дата доступа: 01.05.2017.

3. Май Данциг. Народный художник Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://anonimusi.livejournal.com/602020.html. – Дата доступа: 01.05.2017.

УДК 00.1(09)

– студентка

–

*Научный руководитель* – ***Гусарова Г. А.*** – *канд. ист. наук, доцент*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»,
Горки, Республика Беларусь

Книга – это есть мир, видимый через человека.
*И. Бабель*

Книга – это сокровищница всех богатств. Важнейшее предназначение ее – сохранять знания, накопленные веками, и передавать их следующим поколениям. Благодаря этому стал возможен стремительный прогресс человечества в последние столетия в области науки. Большинство научных открытий делается на основании ранее накопленной и систематизированной информации, результатов опытов из всех уголков мира. Знания, которые мы получаем из книг, позволяют нам двигаться вперед, не тратя время на открытие того, что уже кому-то известно. Книге мы обязаны тем, что сегодня можем наслаждаться шедеврами древней литературы. Чтение книг увеличивает словарный запас человека, способствует выработке более чёткого и ясного мышления, что позволяет формулировать и выражать мысли яснее. Чтение серьезных произведений заставляет нас постоянно думать о том, какую же мысль хотел выразить автор, развивать, поднимать настроение. Книги оказывают значительное влияние на наши нравственные ориентиры и духовное развитие.

Библиотека – один из древнейших культурных институтов сохраненных книг. За долгий период человеческой истории ее социальные функции претерпели существенные изменения. Впервые библиотеки начали появляться на Древнем Востоке. Одной из первых библиотек обычно называют собрание табличек из глины, приблизительно около 2500 г. до н. э. найденных в храме г. Ниппур. На 30 тысячах глиняных табличках записаны тексты на многих языках по грамматике, астрономии, истории, медицине. И это лишь часть гигантской библиотеки – то, что было найдено при раскопках в середине XX в. [4].

Одним из первых книгохранилищ, известных на территории Беларуси, была библиотека Полоцкого Софийского собора, созданная в 1066 г. Часть книг была пожертвована собору полоцким князем Всеславом, правнуком великого киевского князя Владимира, весьма ценившего книги. Княжна Ефросинья Полоцкая, постригшаяся в мона-

хини, занималась пополнением ее фондов, перепиской книг и их распространением. Об этом свидетельствует памятник древней литературы XIII в. «Житие Ефросиньи Полоцкой» [3].

Библиотека Супрасльского Благовещенского монастыря, которая была основана в 1498 г., славилась богатством книг и была одной из крупнейших в Великом Княжестве Литовском. Монастырь пополнял свою библиотеку преимущественно за счет книг, написанных на латинском и польском языках, в том числе напечатанных в Супрасльской типографии. Опись 1764 г. фиксирует в библиотеке 1456 книг. В библиотеке Супрасльского монастыря хранились выдающиеся памятники книжной культуры: Супрасльская летопись XI в. и др.

Процесс формирования библиотек Беларуси находится в постоянном развитии. Сегодня крупнейшей из них является Национальная библиотека Беларуси, которая была основана постановлением Совета Народных Комиссаров БССР в 1922 г. На момент открытия фонды библиотеки насчитывали всего 60 тыс. экземпляров, которыми пользовались 1,1 тыс. человек. Сейчас собрание «алмаза знаний» составляет 9,8 млн. экземпляров и является универсальным по содержанию. Они включают печатные издания, рукописи, микрокопии документов, электронные и другие материалы, созданные как в Беларуси, так и в зарубежных странах на более чем 80 языках**.** В коллекции кириллической печати хранится единственное в Республике Беларусь собрание изданий белорусского первопечатника Ф. Скорины (10 выпусков Библии, Прага, 1517–1519 гг.); «Евангелие учительное» В. Гарабурды (около 1580 г.); «Апостол» (Львов, 1574 г.) и «Библия» (Острог, 1581 г.) И. Федорова; книги из типографии П. Мстиславца, братьев Мамоничей; издания белорусских, русских, украинских печатников XVI–XVIII вв. [3].

Важную роль в распространении знаний играли библиотеки высших учебных заведений, и среди них библиотека *Белорусской государственной сельскохозяйственной академии*, основанная в 1840 г. при Горы-Горецкой земледельческой школе. Первоначально она насчитывала 163 экземпляра книг, но уже в 1850 г. было 4 095 экземпляров, где преобладала иностранная литература. На 1 января 2017 г. фонд библиотеки составлял 1 290 003 экземпляра. Гордость фонда – 10 824 экз. редких рукописных и печатных белорусских, российских и западноевропейских изданий XVIII–XX вв. Во время Великой Отечественной войны значительная часть фонда – журналы, иностранная литература и другие ценные книги – была отправлена в Германию. Здание библио-

теки было взорвано, а оставшиеся книги сожжены. Директор библиотеки Д. Р. Новиков, будучи офицером Советской Армии, дошел до Берлина, где ему удалось напасть на след книг, вывезенных из нашей республики. Им были приняты меры по возвращению этих материалов: написаны письма в ЦК КПБ, в Президиум Академии наук БССР. В конце 1945 г. значительная часть книг была обнаружена и переправлена в Горки. В 2010 г. библиотеке были возвращены 500 раритетных изданий, вывезенных в Германию [2].

К сожалению, в последнее время идет процесс сокращения публичных библиотек. По данным на конец 2015 г., в Беларуси работали 2,9 тыс. публичных библиотек, фонд которых составлял более 67 млн. экземпляров книг, журналов, рукописей и других источников информации. Сегодня книга, на первый взгляд, теряет свои позиции по отношению к другим высокотехнологичным средствам коммуникации. Это не является причиной для того, чтобы перестать читать. Несмотря на все технологии, люди, читавшие электронный документ, быстро забывают его содержимое, но совсем другое происходит, когда читаешь печатную книгу. Поэтому сторонников чтения традиционных книг всегда будет много, ведь общение с печатной книгой вызывает особое чувство, будто общаешься с живым человеком. Поэтому давайте ценить наше наследие, представленное в напечатанном слове, ведь оно и сегодня дает знания о мире, человеке, природе, обществе.

ЛИТЕРАТУРА

1. В Беларуси сокращается количество библиотек и читателей, но страна остается самой читающей в СНГ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://news.tut.by. – Дата доступа: 26.03.2017.

2. Библиотека Белорусской государственной сельскохозяйственной академии: очерки истории и деятельности (1840–2015 гг.) / Г. Е. Медведева [и др.]. – Горки: БГСХА, 2015. – 154 с.

3. Из истории библиотечного дела [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.bla.by. – Дата доступа: 26.03.2017.

4. Первые в мире библиотеки [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://kurskonb.ru. – Дата доступа: 26.03.2017.

УДК 821.161.3
– студэнтка

*Навуковы кіраўнік* – ***Скікевіч Т. І.*** – *канд. філал. навук, дацэнт*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

У XVI – першай палове XVII стст. быў закладзены падмурак для сучаснай беларускай мовы, літаратуры, тэатральнага, музычнага і іншых мастацтваў. Асноватворную ролю ў развіцці беларускай культуры ў гэтыя гады адыграла кнігадрукаванне.

Заснавальнікам беларускага, а разам з тым і ўсходнеславянскага кнігадрукавання стаў асветнік і гуманіст Францыск Скарына (каля 1490 – каля 1551 гг.). У цэнтры яго ўвагі была праблема грамадства і чалавека. Ён разглядаў пытанні сэнсу жыцця, духоўнасці свету, удасканалення грамадства і інш. З 1517 па 1521 гг. у Празе Ф. Скарына выдаў 23 біблейскія кнігі Старога Запавету. У Вільні ён арганізаваў першую ў Беларусі друкарню і выдаў “Малую падарожную кніжыцу” і “Апостал”. Першапачатковую адукацыю Ф. Скарына атрымаў у Полацку. Як мяркуецца, у 1504 г. становіцца студэнтам Кракаўскага ўніверсітэта, аднак дакладная дата паступлення ва ўніверсітэт не ўстаноўлена. У 1506 г. Скарына заканчвае факультэт “сямі вольных мастацтваў” (граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка) са ступенню бакалаўра, пазней атрымлівае званне ліцэнцыята медыцыны і ступень доктара “вольных мастацтваў”.

Пасля гэтага яшчэ пяць гадоў Скарына вучыўся ў Кракаве на факультэце медыцыны, а ступень доктара медыцыны абараніў 9 лістапада 1512 г., паспяхова здаўшы экзамены ў Падуанскім універсітэце ў Італіі, дзе было дастаткова спецыялістаў, каб гэтую абарону пацвердзіць. Насуперак распаўсюджанай думцы, Скарына ў Падуанскім універсітэце не вучыўся, а прыбыў туды менавіта для здачы экзамену на навуковую ступень.

Мова, на якой Францыск Скарына друкаваў свае кнігі, была заснавана на царкоўнаславянскай, але з вялікай колькасцю беларускіх слоў, і таму яна была больш за ўсё зразумелай жыхарам Вялікага Княства Літоўскага. Біблія Скарыны парушала тыя правілы, якія існавалі пры перапісванні царкоўных кніг: утрымоўвала тэксты ад выдаўца і нават гравюры з яго выявай. Гэта адзіны падобны выпадак за ўсю гісторыю выдання Бібліі ва Усходняй Еўропе. З прычыны забаро-

Таким образом, решающую роль в формировании культуры личности играет семья. Она имеет особое значение в формировании эмоционального мира, самосознания и нравственных устоев личности ребенка, так как родители должны подготавливать своих детей к взрослой жизни, и каждый делает это в соответствии со своими идеалами.

ЛИТЕРАТУРА

1. Андриенко, Е. В. Социальная психология: учеб. пособие / Е. В. Андриенко. – М., 2003. – 544 с.

2. Мудрик, А. В. Социальная педагогика: учебник / А. В. Мудрик // под ред. В. А. Сластенина. – 3-е изд., испр. и доп. – М.: Издат. центр «Академия», 2000. – 200 с.

## 3.

УДК 811.161.3

– студентка

–

*Научный руководитель* – ***Добижи С. П.*** – *ст. преподаватель*

УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия», Горки, Республика Беларусь

Китабы белорусских татар – рукописные книги, написанные в XVI–XVII вв. на белорусском языке с использованием арабской графики. Как известно, начиная с XIV в. на территории Беларуси начали селиться татары, которые, забывая родной язык, приобщились к белорусской культуре и языку.

Китабы написаны и читаются справа налево. В библиотеках Вильнюса и Минска хранятся китабы объёмом от 70 до 1000 страниц. Строка в таких рукописях цельная, нет раздела на слова, знаков препинания и написаний с большой буквы. Новое произведение (раздел) начинается словом «баб» (раздел) или «хикайет» (повесть, рассказ).

Китабы – это религиозно-фольклорные тексты, содержащие отрывки из Корана, диалоги пророков с Богом, восточные легенды, описание ритуалов, астрологические наблюдения и морально-дидактические поучения, а также быт, обычаи и традиции татар-переселенцев.

В литературу татар Великого Княжества Литовского вошли переводы с восточных языков на польский и белорусский языки, пересказы восточных текстов, а также тюркские и арабские произведения на языке оригиналов. Тексты местного происхождения представляли собой адаптированные произведения из литературы ВКЛ на польском языке, а также самодеятельное творчество. Китабы возникли в результате переводов книг с восточных языков на народно-диалектный язык местного населения – белорусов. Образцом для книжности белорусских татар была средневековая религиозная литература с мусульманского Востока – Поволжья, Крыма и Турции.

С точки зрения языка китабы представляют собой необыкновенное переплетение восточных и славянских (белорусских и польских) языковых элементов. Мусульманская терминология переведена путем транслитерации или транскрипции.

Как отмечает А. Антонович, в китабах используется более 600 слов терминологического характера, но для обозначения ключевых религи-

озных понятий использовались христианские: *Бог, Пан Бог, прарок, пасол, ангел, рай, пастыр, душа, пекла, грэх,* что свидетельствует о глубоком взаимодействии восточной и белорусской языковых систем. Интересно, что арабское слово *Аллах* используется в цитатах из Корана, а в белорусскоязычных текстах отсутствует.

В текстах китабов параллельно используются арабские и славянские слова, имеющие семантическое сходство: араб. *рызк (средства; имущество; доля*) и бел. *скарбы, пажытак,* польск. *майентнасьць;* араб. *хікайет* и бел. *прыповесць, гісторыя;* араб. *іман* – бел. *вера;* араб. *мейіт* – бел. *умерлы,* польск. *зэшлы, мартвы;* араб. *ферз (долг*) – бел. *павіннасць* и др. Параллельное использование данных слов можно объяснить сильным влиянием белорусского языка.

Под влиянием народно-диалектного языка в китабах широко используется звательный падеж: *Божа, прыяцелю, сыну, браце.* Звательная форма отражает чувства (ласку, нежность, понимание), показывает степень доверия, влияет на отношение читателя или слушателя к персонажу. Интересно, что звательный падеж использовался не только для славянских имен, но и для восточных: *ай, прарочa; ай, шэйху; І, браце Азьраілу; і, коню; і, сынку; ай, таварышу; і, браце Джэбраілу; і, стары чалавеча, і, халопе; ай, посьле* (ад пасол*); і, Адаме; І, Божа; ай, Алейу. І* – тюркское восклицание, соответствующее белорусскому *ай,* в китабах они употребляются параллельно, что также отражает переплетение восточных и славянских языков.

На язык и образную речь китабов большое влияние оказала церковнославянская письменность. Яркими примерами влияния можно назвать употребление причастий настоящего времени с суффиксами *-ушч- (-юшч-), -яшч-: усемагушчы, ласку чынюшчы., слова свайо трымайушчы; халоп блудзяшчэй; вада цекушчайа;* а также с суффиксом *-уч-: слухайучыя, чытайучыя.* Также можно назвать выражения церковнославянского языка, часто употребляющиеся в китабах: *раб божы, раба божайа, халоп божы.*

Таким образом, белорусские китабы, отражающие взаимодействие языковых систем, имеют необыкновенный по выразительности язык и неповторимую стилистику. В китабах проявилось взаимодействие татарской (мусульманской) культуры и христианской книжной культуры Беларуси.

ЛИТЕРАТУРА

1. Антонович, А. К. Белорусские тексты, писанные арабским письмом, и их графико-орфографическая система / А. К. Антонович. – Вильнюс: ВГУ, 1968. – 418 с.

УДК 808.26(072)

– студэнтка

*Навуковы кіраўнік* – ***Скікевіч Т. І.*** *– канд. філал. навук, дацэнт*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Яшчэ ў старажытныя часы людзі сутыкнуліся з праблемай, як звяртацца адзін да аднаго. Мы прывыклі называць кожнага па імені. Імя ў чалавека ўзнікла невыпадкова.

Імёны былі заўсёды і ва ўсіх народаў, але, вядома, не такія, як сённяшнія. А імя вельмі важнае для чалавека. Менавіта яно ў сукупнасці з прозвішчам і імем па бацьку адрознівае нас ад іншых людзей, ідэнтыфікуе. Усе мы па-рознаму ставімся да свайго імя: большасці прыемнае яго гучанне. Невыпадкова псіхолагі раяць, каб выклікаць прыхільнасць да сябе суразмоўцы, часцей называць яго па імені. Часам чалавеку не падабаецца яго імя, і тады жыццё атручваецца вечнай незадаволенасцю сабой і іншымі, бо яны так часта прамаўляюць яго імя. Астролагі лічаць, што імя, дадзенае пры нараджэнні, уплывае на лёс чалавека.

Гісторыя імёнаў, на наш погляд, вельмі цікавая, бо яна не толькі мае дачыненне да гісторыі мовы, але і адлюстроўвае гісторыю краіны. Навука аб уласных імёнах называецца анамастыка. Тэрмін гэты звязаны з грэчаскім словам *онома* – імя. Імёны людзей – частка гісторыі народаў. У іх адлюстроўваюцца побыт, вераванні, фантазія і мастацкая творчасць народаў, іх гістарычныя кантакты. Любое слова, якім называлі чалавека, навакольныя пачыналі ўспрымаць як яго асабістае імя, і такім чынам любое слова магло стаць імем.

Імёны ўласныя жыва рэагуюць на падзеі, якія адбываюцца ў прыродзе і грамадстве. З прычыны асаблівай кансерватыўнасці імёнаў уласных яны перажываюць эпоху, у якую былі створаны, захоўваючы сведчанні больш старажытнага стану мовы, і ўтрымліваюць вялікую моўную і пазамоўную інфармацыю, атрымаць якую можна толькі лінгвістычнымі метадамі.

Народныя формы імёнаў у беларусаў адрозніваліся вялікай разнастайнасцю. Многія з іх утвараліся ад царкоўных (кананічных) імёнаў з дапамогай суфіксаў або ўсячэння: *Канстанцін – Кастусь, Аляксандр – Алесь, Алелька), Алёхна (Аляхно).* Пры гэтым кароткія або суфіксальныя формы ўспрымаліся ў народным побыце як паўнавартасныя імёны

(нешта падобнае назіралася і ва ўкраінскім слоўніку). Набор суфіксаў, з дапамогай якіх утвараліся імёны, быў вельмі шырокі і залежаў ад узросту і сацыяльнага становішча названага.

Маці, як вядома, падбіраюць дзецям самыя ласкавыя імёны, або, інакш кажучы, утвараюць гэтыя імёны ад хрысцільных паводле законаў мовы і прынятых звычаяў. Так, *Антон* будзе *Анцік, Юрый – Юрцік, Міхаіл – Місь, Місцік* і г. д.

Калі на хлопчыка ўжо надзелі штаны і ён стаў падлеткам, то, каб мацней пазначыць гэтую змену ў яго жыцця, яго больш не называюць *Юрцік, Петрык, Анцік*, ён ужо не мамчын сынок, а працаўнік. І імя ў яго ўжо больш падыходнае: *Пятрук, Альгук, Юрка*.

Але вось хлопчык вырас, ён ужо не пастух, а дарослы хлопец. Тут ці сам ён убіўся або, можа, увёў яго хто-небудзь у мужчынскую або дзявоцкую кампанію, на вечарынку або на ігрышчы. Для дзявочай кампаніі такая форма імёнаў, як *Альгук, Пятрук*, яўна не падыходзіць, ды і стары звычай патрабуе ў адносінах моладзі паміж сабой тону ветлівага. І вось у гэтай сферы *Альгукі* самі сабой ператвараюцца ў *Альгееў, Пятрук ў Петрусёў, Юркі ў Юрасёў*.

Нарэшце прыходзіць час жаніцца: пераход “з хлопцаў ды ў мужчынскую славу”. Тут ужо сам Бог загадаў *Ігнасю, Місю, Кастусю* ператварыцца ў *Ігната, Міхала, Кастуша* і г. д. Але час ідзе. Падраслі дзеці. Міхал, Ігнат і Пётра жанілі сыноў. Нявестка, прыйшоўшы ў новую сям’ю, стараецца быць з усімі ветлівай, абыходлівай, і ў першую чаргу з бацькамі мужа. І вось *Зміцер* становіцца *Змітрашом, Бутрамей – Бутрымам* і г. д. І не толькі ў коле сям’і, але і сярод суседзяў.

У крыўскім іменніку існуюць формы імёнаў: для дзіцяці – *Анцік, Петрык*; для падлетка – *Янук, Баўтрук*, для хлопца – *Кастусь, Юрась,* для мужчыны – *Бутрым,* для старога – *Міхайла, Яраш, Асташоў*. (Вацлаў Ластоўскі “Крыўска-беларускі іменнік”, 1918). Пазней многія з гэтых суфіксальных формаў былі згубленыя.

У сучасным беларускім пашпарце імя, імя па бацьку і прозвішча запісваюцца на дзвюх мовах. Беларускія і рускія імёны не транслююцца, а замяняюцца адпаведнымі аналагамі: *Денис – Дзяніс, Ольга – Вольга.* Пры гэтым беларускі варыянт часта можа выкарыстоўвацца выключна “на паперы”, паколькі многія беларусы, якія гавораць у побыце па-руску, выкарыстоўваюць адпаведна рускія варыянты імёнаў (паводле апытанняў, беларускую мову ў побыце стала ўжываюць толькі 6 % беларусаў).

З традыцыйных беларускіх імёнаў найбольшай папулярнасцю карыстаюцца *Алеся і Яна*.

Многія людзі лічаць, што імя валодае пэўнай магічнай сілай і здольна ўплываць на лёс і характар чалавека. Выбіраючы імя нованароджанаму, звяртаюцца да розных кніг, друкаваных выданняў, каб даведацца, што азначае тое ці іншае імя.

Напрыклад, *Марыя* – добрая, разумная, працавітая, прыстойная, надзейная і гуманная. Яна вельмі ўважлівая, заўсёды гатовая прыйсці на дапамогу, у яе характары ёсць цвёрдасць і годнасць. Часам Марыя бывае пахмурнай, ранімай і крыўдлівай. Яна патрабуе да сябе павагі. У сямейным жыцці Марыя вельмі верная жонка, яна гатовая заўсёды ісці за сваім мужам. Яна адданая і клапатлівая маці. *Павел* – вельмі спакойны, добры, спагадлівы, таварыскі і надзейны чалавек. Ён валодае моцнай воляй, добрай інтуіцыяй. Любіць пафіласофстваваць. Павел даволі актыўны, але дзейнічае часта са спазненнем. Бывае помслівым, ніколі нікому не даруе крыўды.

Людзі таксама называюць дзяцей у гонар памерлых ці жывых сваякоў. У гэтым назіраецца даніна памяці, павагі, любові да іх. Выбар імя залежыць ад часу. Змяняецца эпоха, падзеі, аўтарытэты, і разам з імі мяняюцца імёны. Выбар імя часта залежыць ад пеўнеаў моды. Некаторыя імкнуцца назваць дзіця арыгінальным і незвычайным імем: *Ілона, Мілена, Анжаліка* і інш. Здаўна існуе звычай называць дзяцей у гонар святога, у дзень якога яны нарадзіліся. Таксама адбываецца вяртанне састарэлых імёнаў: *Еўдакія, Аксіння, Ягор, Фёдар*.

Вывучыўшы гісторыю паходжання беларускіх імёнаў, можна зрабіць выснову, што імёны ўласныя жыва рэагуюць на падзеі, якія адбываюцца ў грамадстве, змены, таму яны могуць служыць крыніцай інфармацыі пра стан грамадства ў той ці іншы гістарычны перыяд. Але асабістае імя перш за ўсё з’яўляецца неад’емнай часткай жыцця чалавека, а таму кожны павінен ведаць гісторыю яго паходжання і ставіцца да яго з належнай павагай, як да сваіх гістарычных каранёў.

ЛІТАРАТУРА

1. Адамовіч, Я. М. Мікратапанімічныя назвы / Я. М. Адамовіч. – Мінск, 1971.
2. Агеева, Р. А. Происхождение имен, рек и озер / Р. А. Агеева. – М., 1985.
3. Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа / п

УДК 808.26(072)

. – студэнтка

*Навуковы кіраўнік – **Скікевіч Т. І.** – канд. філал. навук, дацэнт*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Пачынаючы размову пра ўласныя імёны і прозвішчы, трэба зазначыць, што галоўная іх роля ў мове – выдзяляць з ліку аднародных прадметаў ці асоб канкрэтны прадмет ці асобу (аб'ект) і супрацьпастаўляць яго іншым аднародным прадметам ці асобам (аб'ектам). Уласныя імёны не перакладаюцца з адной мовы на другую, яны не маюць лексічнага значэння.

У старажытных славянскіх плямёнаў было толькі асабістае імя ці больш правільна – мянушка, бо людзей называлі па нейкім падабенстве з раслінай, свойскай жывёлінай, нават са зверам (*Воўк, Заяц, Мядзведзь, Дуб, Клён, Ясень*). Называлі па іншых прыметах, напрыклад, абставінах нараджэння: доўга чакалі сына, значыць, называлі *Жданам* або *Чэканам*. Маглі звязваць імя з пэўнай рысай характару: *Дабрыня, Волат, Пярун*.

Калі ж адбылося ў Кіеўскай Русі хрышчэнне славян, калі яны з паганцаў (язычнікаў) ператварыліся ў праваслаўных, хрышчоных людзей, дык і імёнаў адразу прыбавілася. Візантыйская царква падаравала ўсходнім славянам не толькі сваю веру ў Бога, а яшчэ шмат назваў святых, чые імёны і даваліся царквой пры хрышчэнні народжаных дзяцей. Ніхто, акрамя святара, не мог вызначыць імя, а ён браў з іменаслова тое, што прыпадала на дзень нараджэння, і замацоўваў яго за чалавекам навечна. Гэта было так званае кананічнае (дадзенае па законе) імя, якое прыйшло ці з грэчаскай, ці з лацінскай мовы. Шмат пазычана было імёнаў з лацінскай мовы ў перыяд далучэння Беларусі да Польшчы.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі пачалося аказёньванне імёнаў, прозвішчаў, асабліва калі праводзіліся розныя перапісы, перадзелы зямлі, наборы ў армію. Усё рабілася "на расійскі капыл", а ў дадатак яшчэ прылучалася малапісьменнасць многіх пісараў. Выкрэсліваліся дашчэнту самабытныя беларускія імёны: *Ян, Мікола, Марыся, Антуніна, Прузына, Алеся*, а замест іх запісвалі *Іван, Нікалай, Марыя, Антаніна, Еўфрасіння, Аляксандра.*

Пры цараванні Пятра I (XVII–XVIII стст.) удалося забараніць усе нецаркоўныя імёны. Затое шырока пайшло карыстанне, асабліва ў вярхах, нямецкімі, французскімі, англамоўнымі імёнамі.

Пасля перамогі Кастрычніка Савецкая ўлада скасавала абавязковасць царкоўных імёнаў, адкрыла насцеж вароты для іншамоўных запазычанняў і наватвораў. Пайшлі шырока гуляць запазычанні з розных, асабліва заходніх, народаў (*Эдуард, Альберт, Ала, Жанна*), іншамоўныя (*Геній, Авангард, Ідэя, Паэма*), абрэвіятуры (скарачэнні) цэлых выразаў, народжаных новым часам (*Уладлен – Уладзімір Ленін, Марлен – Маркс* і *Ленін*), імёны *Перабудова, Дэмакратыя, Галоснасць*. Усё гэта сведчыць пра тое, што свабода выбару імёнаў патрабуе перш за ўсё развагі.

Нельга прыдумваць бясконца новыя імёны. Лепш навучыцца разумна карыстацца тым, што прыдумана або ўтворана ўжо, пашыраць колькасць імёнаў за кошт даўно забытых, зручных і мілагучных.

Самым характэрным у апошнія гады для выбару імёнаў з'яўляецца вяртанне да ўсенародна прызнаных усходнімі славянамі спрадвеку імёнаў *Алесь, Уладзімір, Вольга, Таццяна, Вера, Надзея, Любоў, Наталля…* Самымі высакароднымі жаданнямі жывуць бацькі тады, калі падбіраюць імя свайму нованароджанаму, аднак жа колькі клопатаў і намаганняў спатрэбіцца, каб дапамагчы гэтаму чалавеку апраўдаць гучнае імя.

Як мы бачым, гісторыя паходжання імёнаў даволі-такі рознабаковая, і разважаць на гэту тэму можна бясконца. Але не менш цікавая і гісторыя паходжання прозвішчаў. Гісторыя паходжання прозвішчаў у пачатку свайго развіцця нават мае пэўнае падабенства з гісторыяй паходжання імёнаў.

Прозвішчы на Беларусі пачалі складацца ў XV–XVII стст. У беларусаў спачатку пераважалі імёны-мянушкі, мэтай якіх было найбольш поўна вызначыць асобу чалавека адпаведна яго вонкаваму выгляду ці характару. У аснову мянушак бралася (як і спачатку ў аснову імёнаў) падабенства да жывёл, птушак, рыб, раслін і розных рэчаў (*Баран, Бык, Казёл, Трус, Камар, Певень, Кулік, Шпак, Карэц, Крук, Гуж*). Некаторыя мянушкі даваліся яшчэ і па занятку ці прафесіі чалавека (*Бондар, Бортнік, Вазніца, Ганчар, Дойлід, Дзяк, Казак, Катляр, Кухар, Шынкар*), па становішчы ў грамадстве (*Багач, Завада, Прыйма, Солтан, Царук*), па часе нараджэння (*Першынец, Пазняк, Трацяк, Адзінец*).

Мянушкай магло стацца любое слова, што было ў чалавека на языку. Здараліся і словы-лаянкі, нават непрыстойныя, брыдкія. На аснове імёнаў-мянушак утварылася вялікая колькасць прозвішчаў беларусаў. Імёны-мянушкі ставіліся звычайна пасля афіцыйнага, царквой дадзенага імя. У даўніх дакументах сустракаюцца самыя дзіўныя спалучэнні, напрыклад, *Заяц Грышкавіч, Жук Іванавіч, Кот Марцінавіч*, альбо падвойныя імёны – *Ян Ілька, Пётра Міцута, Мікалай Юдка*.

Імя бліжэйшае да асобы чалавека, прозвішча – паняцце шырэйшае, адно агульнае для ўсёй сям'і, а то, бывае, і для цэлай вёскі, якая так і завецца. Напрыклад, *Пруднікі*. Пасяліўся чалавек каля сажалкі, пруда, і прозвішча ў яго з'явілася *Пруднік*. Пайшлі дзеці, выраслі, пажаніліся, завялі цэлыя сем'і. Глядзіш, і цэлая вёска ўзнікла – *Пруднікі*.

Прыдумваць прозвішча дапамагалі картографы, калі пачалі пераносіць населеныя пункты на паперу, царкоўныя святары, калі запісвалі прозвішчы тых, хто браўся шлюбам, пісары ў паветах і розных установах, вайсковыя, калі замянялі прозвішчы на іншы лад.

Самыя папулярныя ў Беларусі прозвішчы на *скі/-цкі*: *Азёрскі, Залескі; -оў/ -/ёў, -ін/-ын: Свярдлоў, Васільеў, Ванін, Дубін* і інш.

Многія прозвішчы нараджаюцца ў творчых пакутах, але затое яны жывуць вечна, з'яўляюцца паходнямі, што асвятляюць шлях мільёнам: *Пушкін, Талстой, Шаўчэнка, Купала, Колас…*

Ведаць вытокі сваёй радаводнай трэба кожнаму чалавеку хоць прыблізна. Вось чаму да катэгорыі жывога слова трэба аднесці паходжанне прозвішча чалавека, якое ў значнай ступені пралівае святло на вытокі роду кожнай сям'і і прымушае задумацца над асабістай гісторыяй і тымі нябачнымі повязямі, якія нітуюць яе з гісторыяй грамадства. Нельга быць Іванамі, якія не памятаюць сваяцтва.

ЛІТАРАТУРА

1. Шур, В. В. З гісторыі ўласных імёнаў / В. В. Шур; пад рэд. П. У. Сцяцко. – Мінск: Вышэйш. шк., 1993. – 156 с.

2. Юрэвіч, У. Слова жывое, роднае, гаворкае…: дапам. для настаўнікаў / У. Юрэвіч. – Мінск: Маст. літ., 1998. – 282 с.

3. http://nn.by/?c=ar&i=108809.

4. https://charter97.org/be/news/2016/8/9/217638/.

5. http://czeslaw-list.livejournal.com/269992.html.

УДК 808.26(072)

– студэнткі

*Навуковы кіраўнік* – ***Селібірава Л. У.*** *– ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Кожны год падзелены на чатыры пары года, а кожная пара года – на тры месяцы.

Слова "год" паходзіць ад дзеяслова "годити", што значыць "дагаджаць", "задавальняць", "падыходзіць". Спачатку лексема "год" азначала "зручны час", затым проста "час". А з цягам часу, калі астраномы палічылі, што кола звароту Зямлі вакол Сонца роўнае тромстам шасцідзесяці пяці суткам, слова "год" трывала прывязалі да гэтай лічбы.

Слова "месяц" утварылася ад лацінскага *mensis* ("месяц"). У рускай мове слова "месяц" трактуецца як "дзіця Макошы" (багіні ўрадлівасці).

Так, кожны год мы пражываем 12 месяцаў, і кожны з іх па-свойму ўнікальны і асацыюецца для нас з рознымі падзеямі. Не дзіўна, што кожны месяц мае сваю ўнікальную назву.

Старажытныя помнікі пісьменства паказваюць, што месяцы мелі славянскія назвы, паходжанне якіх было цесна звязана са з'явамі прыроды.

Разгледзім падрабязна паходжанне назваў беларускіх месяцаў.

***Зімовыя месяцы.***

***Снежань*** **–** першы месяц зімы і апошні месяц каляндарнага года (паходзіць ад слова "снег"). Старабеларускае найменне – "просінец" (у значэнні "прасвет у воблаках"), старарускае – "студёный".

***Студзень*** **–** першы месяц каляндарнага года. Старая славянская назва "сечань" – ад слова "секчы" (секчы лес). Звычайна рубка лесу для падрыхтоўкі новых пасяўных плошчаў і яго нарыхтоўкі для будаўніцтва рабілася зімой.

Яшчэ адна старая назва гэтага месяца – "просінец" (неба ў сувязі з павелічэннем працягласці дня насычаецца сінню ці пачынае ззяць (прасіянне)). Іншае меркаванне: "просінец" звязваецца з народным звычаем правядзення святак, у якія было прынята хадзіць па хатах і прасіць пачастункі. Радзей назву звязваюць з просам (дзень павялічваецца зусім па ледзь-ледзь, па зярнятку проса) і парасём. А

больш позняя назва “студзень”, або студны, ад сцюжы і маразоў, характэрных для таго часу.

***Люты*** (старая назва “снежань”) быў самым снежным месяцам. Існавалі і іншыя назвы: “межань” (які стаіць паміж зімой і вясной), “люцень” (з-за лютых вятроў, завей і маразоў), “бакагрэй” (сонейка ўжо прыгравае – і жывёлы выходзяць пагрэцца).

***Веснавыя месяцы.***

***Сакавік.*** Сучасная беларуская назва трэцяга месяца года і першага месяца вясны паходзіць ад слова “сок”. У гэтую пару сок пачынае цячы з дрэў.

***Красавік.*** Назва чацвёртага месяца года паходзіць ад слова “красавац”, бо ў красавіку з’яўляюцца першыя краскі-кветкі. Гэтаму адпавядае і другое найменне, што сустракаецца ў старажытнай літаратуры, – “квецень”. У прыватнасці, яго ўжывае Ф. Скарына ў “Малой падарожнай кніжыцы”. Такая ж форма захавалася ва ўкраінскай мове – “квітень”. У старажытных славян чацвёрты месяц яшчэ вядомы як “беразоль”.

***Май.*** Сучаснай беларускай літаратурнай назве месяца адпавядае старажытнабеларуская назва “травень”, якая паходзіць ад слова “трава”, бо ў гэтым месяцы года зямля пакрываецца зеленню. Май – адзіная ў беларускай мове назва, узятая з лацінскай мовы. Такая ж лацінская аснова таксама ў нямецкай і французскай мовах – *mai*, англійскай – *may*, польскай – *maj*, венгерскай – *május*, рускай – *май* і інш.

***Летнія месяцы.***

***Чэрвень*** – чырвоны месяц (ці то з-за агульнай велічы прыроды, ці то ў сувязі з пасляваннем (пачырваненнем) першых ягад). Яшчэ адно меркаванне: чэрвень матывуецца словам “чарвяк”, таму што гэта месяц збірання ў садах і гародах насякомых-шкоднікаў.

***Ліпень***. Сучасная беларуская назва сярэдняга, самага спякотнага месяца лета паходзіць ад слова “ліпа” (дрэва цвіце менавіта ў гэтую пару). Найменне мае падабенства з польскім “lipiec” і ўкраінскім “липень”.

***Жнівень.*** Сучасная беларуская назва восьмага месяца года, як і старабеларускія найменні “серпень”, “зарев”, адлюстроўвае прыродныя асаблівасці пары (“жаць”, “жніво”).

***Восеньскія месяцы.***

***Верасень.*** “Вресень”, “руин”, “риень”, “зарев” – гэтым старабеларускім найменням дзявятага месяца года адпавядае сучаснае беларускае “верасень“, што паходзіць ад слова “верас”.

***Кастрычнік*** – сярэдні месяц восені, характарызуецца зменлівым надвор’ем: бываюць густыя туманы, слата, частыя прымаразкі, а часам выпадае і снег. Дрэвы стаяць аголеныя, птушкі адляцелі ў вырай. Наступае пара для садаводаў: пасадка дрэў і ягаднікаў, абмазванне ствалоў глінай і вапнай, іх ацяпленне. Народны каляндар месяца небагаты. Яго асноўнае свята – Пакровы.

***Лістапад.*** Сама назва месяца гаворыць за сябе: лістапад – падае лісце (ападае). У пачатку лістапада адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, тэмпература паветра ніжэйшая за нуль, з’яўляюцца туманы. Імжыстыя дажджы ў другой палове месяца змяняюцца на мокры снег.

Як паказвае прааналізаваны матэрыял, назвы беларускіх месяцаў утвораны пераважна ад старажытных асноў (праславянскіх, індаеўрапейскіх). Большая частка найменняў матываваная імёнамі (назоўнікамі і прыметнікамі), радзей – дзеясловамі. Гэта тлумачыцца тым, што назвы месяцаў узнікалі часцей за ўсё на базе прадмета (сімвала таго ці іншага перыяду) або прыкметы (параўнання (падабенства)).

Так, у беларускіх назвах месяцаў большай часткай адбіліся ўмовы характарыстыкі з’явы (навальніца, дождж, вецер, завіруха, зара, бліскавіца, кроплі дажджу) і стану (холад, сцюжа, мароз, спякота, красаванне), а таксама галоўныя клопаты і спадзяванні сялян, звязаныя з іх практычнай дзейнасцю: земляробствам, сенажаццю, жнівом, уборкай ураджаю, апрацоўкай ільну.

Досыць вялікую групу складаюць народныя назвы месяцаў, матываваныя назоўнікамі са значэннем расліны (*травень, ліпень, верасень*). А такія найменні, як чэрвень, ліпень і іншыя, могуць сведчыць, на нашу думку, пра зараджэнне ў продкаў эстэтычных пачуццяў ва ўспрыманні навакольнага свету, аб развіцці такога паняцця, як прыгажосць.

ЛІТАРАТУРА

1. Паходжанне беларускіх назваў месяцаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://retroman.ru. – Дата доступу: 05.03.2017.

УДК 398(476)

. – студэнт

*Навуковы кіраўнік –* ***Дабіжы С. П.*** *– ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Прыказкі – гэта створанае народам лаканічнае, вобразнае выслоўе з павучальным зместам, якое мае прамы і пераносны сэнс. Прыказка зліваецца са зместам моўнага выказвання, надаючы яму непаўторнасць і выразнасць.

Прывабнасць прыказак не толькі ў іх мудрасці, дасціпнасці, але і ў надзвычайнай дасканаласці формы. Глыбокая думка, рыфма, рытміка, вобразная, лаканічная мова ствараюць дасканалы мастацкі твор, які лёгка запамінаецца.

Мэта дадзенай работы – сабраць і прааналізаваць прыказкі вёскі Плотніца Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, зрабіць іх класіфікацыю паводле тэматычных груп, да мясцовых прыказак знайсці літаратурныя адпаведнікі.

У выніку праведзенай працы былі сабраны і апрацаваны 34 прыказкі, якія складаюць 7 тэматычных груп.

Самай вялікай па колькасці адзінак з'яўляецца тэматычная група "Гаспадарка, праца, руплівасць", якая ўключае дзесяць прыказак. Праца на зямлі заўсёды была асноўным заняткам беларускага селяніна, працавітасць лічылася самай галоўнай рысай характару.

Прыказкі ўслаўляюць любоў да працы і ганьбуюць ляноту і гультайства: "Нычого самэ нэ зробытца"; "Поспэшыў – людэй насмэшыў"; "З косою погоды нэ ждуць"; "Хто ў болоты жывэ, той сіно робыть"; "Хоть брат ты мій, а хліб іш свій"; "Хто скупы, той нэ дурны"; "Було б здороўе, робота будэ"; "Каждые граблі до сэбэ грэбуць"; "Субота – баб'я робота"; "Вочы боятца, а рукы робляць".

Цікава, што шырока прадстаўлена тэматычная група "Заганы чалавечага характару, недахопы людзей", да якой мы адносім сем прыказак: "Баба з коліс – колёсам лэгчій"; "Горбатого і могыла нэ справыть"; "На від малынка, а роскусы – глынка"; "Ны кожы, ны рожы"; "Як бэльмо на воку"; "Яблыко од яблыні далэко нэ падае"; "Ты до ёго шчырым сэрцэм, а він до тэбэ гіркім пэрцэм".

Тэматычная група "Сям'я, каханне, жаніцьба, сваяцкія адносіны" ўключае сем прыказак: "Пэчынка нэ мясо, а швагер нэ родня";

“Дэржыса за ёго, як рак за бэрог”; “Рыбка шчэ в рэцэ, а нэ в руцэ”; “Новэ сітцэ на колочку”; “Дэ ў сэм’і лад, там і діты добрэ годуютца”; “Діўкою була – рэвла, замуж вышла – завыла”; “Стаў багаты, то выгнаў і брата з хаты”.

Тэматычная група “Духоўнасць, высокія маральныя якасці чалавека” складаецца з чатырох прыказак: “За шчо кого осудыш, у тым сам побудэш”; “За які гріх кого осудыш, у тый сам попадэш”; “Нэ хлібом одным жывэ чоловік”; “Нэ місцэ красыть чоловіка, а чоловік місцэ”.

Тэматычная група “Любоў да Радзімы” прадстаўлена толькі трыма прыкладамі: “Дома і солома едома, а на чужын і гарачэ сало стыне”. “Родына – матка, а чужына – мачыха”; “Родная зэмля мякчій чужої пэрыны”.

У тэматычную групу “Гасціннасць, суседскія адносіны” мы ўключылі дзве прыказкі: “Чым маю, тым прымаю”; “У суседстве жыты – одын другому служыты”.

Тэматычная група “Багацце і беднасць, шчасце і гора” ўключае адну прыказку: “Одна бэда нэ ходыць, а другую за собою водыць”.

Трэба зазначыць, што некаторыя прыказкі могуць уваходзіць у дзве і нават тры групы прапанаванай намі класіфікацыі. Так, прыказку “Стаў багаты, то выгнаў і брата з хаты”, уключаную ў групу “Сям’я, каханне, жаніцьба, сваяцкія адносіны”, можна ўключыць і ў групу “Заганы чалавечага характару, недахопы людзей”.

Многія прыказкі, што ўжываюцца ў вёсцы Плотніца, маюць літаратурныя адпаведнікі, аднак тры запісаныя намі прыказкі (“Пэчынка нэ мясо, а швагер нэ родня”, “Залізь у камыш і не дыш”, “Ты до ёго шчырым сэрцэм, а він до тэбэ гіркім пэрцэм”) не маюць адпаведнікаў у беларускай літаратурной мове.

Беларускія прыказкі – скарбонка духоўнай сілы народа, у іх адлюстраваны жыццё, культура, думкі і пачуцці беларусаў. У прыказках нашы продкі занатавалі свае высокія памкненні і мудрыя запаветы, свой надзвычай багаты калектыўны вопыт, што набылі за многія стагоддзі існавання на зямлі.У прыказках акрэслены тыя маральныя законы і правілы, якімі чалавеку неабходна кіравацца і сёння.

ЛІТАРАТУРА

1. Дубянецкі, Э. С. Таямніцы народнай душы / Э. С. Дубянецкі. – Мінск: Народная асвета, 1995. – 48 с.

2. Каўрус, А. А. Слова наша роднае / А. А. Каўрус. – Мінск: Народная асвета, 1986. – 144 с.

УДК 355.48(575.4)

– студентка

–

*Научный руководитель – **Малько А. И.** – канд. филол. наук, доцент*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»,
Горки, Республика Беларусь

Находясь на учебе в Беларуси, мы, иностранные студенты, интересуемся традициями и обычаями этой гостеприимной республики. Вместе с белорусами мы отмечаем их национальные праздники, а также праздники, общие для народов Беларуси и Туркменистана: Новый год, 8 Марта, День Победы. Но мы никогда не забываем и о своей родной стране, отмечаем свои национальные праздники, и тоже вместе с белорусами, которым мы благодарны за уважение к нашей культуре и традициям.

Туркменская земля богата праздниками – радостными и весёлыми. Праздник весны и равноденствия, возвращения к истинным истокам, щедрости и изобилия, духовного единения, человеколюбия и настоящего земного счастья – прекрасный и вечно юный Новруз. Новруз по восточному календарю – один из главных праздников ранних земледельцев, многие тысячелетия назад населявших эту землю, – удивительно органично сочетает в себе древние истоки и новизну. Его отмечают ежегодно 21 марта – в день, когда светлое и тёмное время суток приходят в равновесие и на земле царит равноденствие. Завершающие год последние дни перед Новрузом – время подведения своеобразных итогов. Каждый спешит рассчитаться с долгами, попросить прощения за мелкие обиды, заготовить приятные сюрпризы и подарки. И наступает долгожданное утро «нового дня» – «нау руз». Новруз начинает шествие по земле, заглядывая в каждый дом, каждое сердце. Все люди наряжаются в обновки.

Замечательной традицией праздника становится организация выставок, на В Ð&p Z bob t g•!&€ rbĥ‡• ая анйЖ

Особой популярностью у многочисленных гостей праздника пользуется юрта «ак бу». Требуются сноровка и умение, чтобы в мельчайших деталях восстановить старинное жилище, с которым туркмены связывали своё видение мироустройства, пути достижения гармонии с окружающим миром и постижение тайного хода загадочных небесных светил.

Восточный новый год ступает на благодатную туркменскую землю вместе с весельем и собственными сказочными персонажами: это убелённый сединами Новруз-баба и его верная спутница – красавица Весна-Бахар, дарящая нарядное цветение и изумрудную зелень родным просторам, колоритный владыка из восточных сказок – царь Джемшид – с его таинственным блюдом, раскрывающим все тайны и показывающим самые диковинные уголки Земли. Они становятся неотъемлемой частью музыкально-художественных композиций.

Звучит мелодия дутара, уводящая слушателя в удивительный мир туркменской поэзии. Бессмертные стихи истинных сынов этой земли и мастеров поэтического слова – Махтумкули, Андалиба, Молланепеса, Сейди, Мятаджи и Зелили – вновь повествуют о высших духовных и нравственных ценностях родной Отчизны.

Во время праздника проводятся состязания богатырей-пальванов, сказителей-бахши и острословов. Эти соревнования перемежаются с играми, зрелищными петушиными боями, номерами мастеров-канатоходцев, восточных иллюзионистов-факиров, самодеятельных художественных и театральных коллективов, спортивными выступлениями и скачками быстроногих ахалтекинцев. Красочное праздничное действо длится несколько дней на радость молодёжи, излюбленным развлечением которой становится качание на качелях – «хиннилдик».

И конечно же, нарядный, хлебосольный дастархан – символ изобилия солнечного туркменского края. Многообразие и изысканность кулинарных блюд радуют глаз и наполняют душу бесконечной любовью и уважением к трудолюбивому народу, пронёсшему через века неистребимую волю к жизни, созиданию, обогатившему общечеловеческую духовную сокровищницу столь восхитительным, удивительно живучим в веках явлением, каким стал Новруз.

ЛИТЕРАТУРА

1. Байриева, А. Туркменские обряды хранят народные традиции [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://guide.travel.ru/turkmenistan/5242.html.

2. Обычаи и традиции Туркменистана [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.centralasia travel.com/ru/countries/turkmenistan/custom.

УДК 355.48(575.4)

. – студентка

*Научный руководитель* – ***Малько А. И.*** – *канд. филол. наук, доцент*
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия»,
Горки, Республика Беларусь

Основными отличительными чертами этноса являются присущие ему традиции и обычаи. Сформированные на ранних стадиях развития человеческого общества, они сохраняют свою историческую значимость, являются частью современной жизни, выполняя воспитательную, эстетическую функции, оказывая влияние на мировоззрение и поведение представителей того или иного народа.

Туркменистан – страна, в которой особенно бережно относятся к дошедшим до настоящего времени традициям и обычаям, многие из которых сложились под влиянием религии. И это не случайно: в Туркменистане достаточно строго соблюдаются законы шариата, служащие своеобразными правилами, обязательными для всех.

Исламская религия играла важнейшую роль в становлении туркменских традиций на протяжении веков. Она и сейчас составляет основу жизни населения, в том числе и молодежи. Мусульманские обряды и обычаи стали общенациональными и соблюдаются практически всем коренным населением Туркменистана.

Традиции тесно связаны с ментальностью туркменского народа. Результатом социально-экономического и культурного развития страны стали такие национально-психологические особенности народа, как высокая степень эмоциональности, воинственность, свободолюбие, неприятие власти над собой, умение переносить боль и страдания.

Свойственно туркменам и высокое честолюбие, тесно сопряженное с обидчивостью. Нанесенные даже случайно обиды туркмены помнят долго, переживают глубоко, прощают их только в том случае, если обидевший полностью признает свою вину и в присутствии других людей принесет извинения. На их поведении сказываются многие предрассудки, в том числе и такие, как кровная месть обидчику. Месть даже через довольно продолжительное время может проявляться в жестоких формах по отношению к оскорбившему их человеку [1].

Традиционно для туркменского общества свойственно почтительное отношение к людям старшего возраста – «аксакалам». Пожи-

лые люди, родители пользуются непререкаемым авторитетом: их просьбы являются обязательными для выполнения, с их мнением считаются все без исключения.

Другая общетуркменская традиция – уважительное отношение к труженику. Для туркмена любой труд важен и ценен, поэтому каждый человек, проходя мимо дехканина (крестьянина), работающего на поле, обязательно скажет ему: «Пусть каждое зерно станет тысячей» или «Пусть хорошо взойдет семя».

Туркменистан славится своими традиционными праздниками, сопровождающимися разнообразными обрядами. Кульминацией праздника Курбан-байрам является обряд жертвоприношения, который совершают все верующие. После обряда готовятся угощения из мяса жертвенного животного, приглашаются родные, близкие, соседи. Сегодня Курбан-байрам любим и почитаем среди молодежи. Особенно многолюдно возле установленных по этому случаю высоких качелей, которые являются неотъемлемым национальным атрибутом праздника. Этот красивый обряд придает замечательному празднику неповторимый национальный колорит. Как гласит поверье, человек, качаясь на взмывающих прямо к небу качелях, очищается от грехов [2].

Любимый праздник туркменов – Новый год – отмечается весной. По восточному преданию, в ночь с 21 на 22 марта из-под земли поднимается всесильный дух, который приносит свет, исцеляет больных и слепых, дарует мир всем верующим. С наступлением праздника прекращались войны, конфликты и распри. Празднование проходило ночью на больших полянах. Сначала совершался старинный ритуал: «Если увидишь родник – расчищай его источник». И все люди с лопатами и кетменями освобождали путь пробивающимся родникам. Некоторые обычаи появились после принятия мусульманства: обычай украшать дом зелеными ветками, выбрасывать старые предметы домашней утвари и приобретать все новое.

Традиции и обычаи сопровождают и всю семейную жизнь туркмен. Традиционная семья отличается строгим распределением обязанностей между супругами. Очень важным в такой семье считается воспитание подрастающего поколения: ему передаются семейные ценности, прививаются нормы и правила устоявшегося семейного уклада. Однако в последнее время, особенно в больших городах, брачные союзы туркменской молодежи все чаще выходят за рамки традиций: сегодня основанием для заключения брака становятся не экономическая выгода, не договоренность между родственниками будущих жениха и неве-

сты, а чувства молодых людей. Понемногу меняются и обязанности: возрастает роль женщины в семье, которая получает возможность зарабатывать деньги, мужчины все чаще помогают жене по хозяйству и в воспитании детей.

Многие семьи считают себя современными, но вместе с тем не отошедшими от традиций, которые поколениями складывались в народе. Даже в крупных городах традиционный уклад семейной жизни продолжает преобладать во внутреннем сознании людей. Традиции, сохранившиеся по сей день, имеют важную психологическую, экономическую, историческую, этническую значимость. Современной семьи вне причастности к традициям в Туркменистане нет, и вряд ли в ближайшем будущем ситуация изменится.

В наше время в Туркменистане существуют племенные группы, живущие своим собственным замкнутым кругом, отдельными кланами, в которых сохранились обычаи почти в первозданном виде. Представители той или иной общины легко могут отличить «своего» от «чужака» по диалекту, стилю одежды, украшениям, вышивке и даже по фактуре и стилю ковров.

В последнее время туркменская молодежь проявляет повышенный интерес к истории своей Родины, к ее культурному наследию, к традициям, которые бережно сохранили их деды и прадеды. Важные традиции и обычаи, связанные с определенными этапами жизни человека, актуальны и сейчас. К ним бережно относятся, их чтут, им следуют все без исключения: и древние старцы, и молодые туркменские юноши и девушки.

## ЛИТЕРАТУРА

1. Давлетов, Д. Туркменский аул в конце XIX – начале XX века / Д. Давлетов. – Ашхабад: Ылым, 1977. – Ч. 1: Развитие товарно-денежных отношений в аулах Закаспийской области – 224 с.

2. Древняя туркменская земля встречает Курбан-байрам [Электронный ресурс] / Режим доступа: http://gundogar-news.com/index.php?category_id=5&news_id=894.

3. Байриева, А. Туркменские обряды хранят народные традиции [Электронный ресурс]. – А. Байриева. – Режим доступа: http://guide.travel.ru/turkmenistan/5242.html.

4. Обычаи и традиции Туркменистана [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.centralasia travel.com/ru/countries/turkmenistan/custom.

УДК 808.26(072)

– студэнт

*Навуковы кіраўнік* – ***Скікевіч Т. І.*** *– канд. філал. навук, дацэнт*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Спецыфіка моўнай сітуацыі ў Беларусі ў тым, што ў ёй адначасова існуюць дзве дзяржаўныя мовы: беларуская і руская, прычым апошняя з’яўляецца найбольш ужывальнай ва ўсіх сферах жыцця.

Абумоўлена гэта перш за ўсё прычынамі палітычнага характару. Як вядома, у Савецкім Саюзе была пастаўлена задача стварэння новай супольнасці людзей – савецкі народ – з адзінай культурай, “нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па змесце”. Пры гэтым меркавалася, што мовай гэтага народа будзе руская. Найбольш разбуральныя наступствы палітыка русіфікацыі мела на тэрыторыі Беларусі.

У сямідзясятыя гады мінулага стагоддзя ў БССР адбывалася інтэнсіўнае перасяленне з вёсак у гарады. На пачатку 1970 г. сельскае насельніцтва рэспублікі складала 56,7 %, гарадское – 43,3 %, на пачатку 1979 г. – адпаведна 45,1 % і 54,9 %. Беларускія гарады былі ў асноўным рускамоўнымі, а ў вёсках гаварылі па-беларуску. Перасяляючыся ў горад, чалавек імкнуўся адпавядаць свайму новаму сацыяльнаму асяроддзю. Вялікую ролю адыграла і тое, што беларуская і руская мовы падобныя між сабой, таму часта на побытавым узроўні беларуская мова ўспрымалася як няправільная руская, а чалавек, які на ёй размаўляў, – як той, хто не валодае моўнай культурай.

Паступова ў Беларусі сфарміраваўся своеасаблівы білінгвізм: пераважная частка насельніцтва гаварыла на так званай *трасянцы* (навуковае паняцце *інтэрферэнцыя* – ‘ужыванне элементаў адной мовы пры маўленні на другой’). Паводле сацыялагічнага апытання, праведзенага ў 2011 г., каля 88,37 % рэспандэнтаў адказалі, што ў штодзённых зносінах выкарыстоўваюць сумесь беларускай і рускай моў, 11,22 % – рускую і 0,41 % – беларускую мову.

Што тычыцца друку, то, па дадзеных Белстата, толькі 9 % найменняў кніг і брашур, выдадзеных у 2011 г., былі на беларускай мове (на рускай – 85 %). Сярод часопісаў і іншых перыядычных выданняў на беларускай мове выходзіла толькі 17 % (на рускай – 81 %). Доля газет на беларускай мове ў 2011 г. склала толькі 26 % (на рускай мове – 73 %). Асноўная частка перадач на беларускім тэлебачанні вядзецца на

рускай мове. Паводле сацыялагічных даследаванняў, чытацкая аўдыторыя кніг на беларускай мове скарацілася ў 2011–2013 гг. з 14 % да 5 %.

У афіцыйнай сферы выкарыстанне беларускай мовы абмежавана. Судаводства ў Беларусі цалкам рускамоўнае, справаводства на беларускай мове амаль адсутнічае.

Тым не менш большасць насельніцтва Беларусі выступае катэгарычна супраць надання статусу дзяржаўнай толькі беларускай мове. Моўная сітуацыя ў Беларусі мае некалькі парадаксальны характар. Нягледзячы на тое, што большасць беларусаў прызнаюць, што ў штодзённых зносінах яны карыстаюцца альбо змешанай мовай (трасянкай), альбо рускай мовай з выкарыстаннем беларускіх слоў, сваёй роднай яны лічаць менавіта беларускую мову.

Па выніках перапісу 2009 г., 53,2 % насельніцтва Беларусі назвалі беларускую роднай мовай, а 23,4 % – мовай, на якой размаўляюць дома, рускую – 41,5 % і 70,2 % адпаведна.

Газета “Звязда” – адзінае ў Рэспубліцы Беларусь агульнадзяржаўнае штодзённае (выходзіць пяць разоў на тыдзень) перыядычнае выданне на беларускай мове. Іншыя газеты падобнага роду з’яўляюцца альбо рускамоўнымі, альбо двухмоўнымі, альбо беларускамоўнымі штотыднёвікамі культуралагічнай накіраванасці (“Культура”, “ЛіМ”). Заснавальнікамі “Звязды” з’яўляюцца Нацыянальны сход і Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, тыраж вагаецца ў межах 32–34 тыс. экзэмпляраў (для параўнання, наклад рускамоўнай газеты “Савецкая Беларусь”, заснавальнікам якой з’яўляецца Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, складае 400 тыс.).

Многія журналісцкія тэксты разгляданага выдання сапраўды шчыра прасякнуты трывогай за стан беларускай мовы і з поўным правам могуць быць прылічаныя да разраду “канцэптуальнай журналістыкі”. Падборкі і агляды чытацкіх лістоў, якія сістэматычна публікуюцца, сведчаць аб цесным узаемадзеянні супрацоўнікаў рэдакцыі са сваімі адрасатамі, дазваляюць вырашаць, пытанні, якія ўзнікаюць ў моўнай сферы (напрыклад, адкрыццё беларускамоўных класаў у школах і груп у дзіцячых садках). На старонках газеты часта ўзнікаюць дыскусіі аб правамернасці ўжывання тых ці іншых слоў, да якіх падключаюцца вядомыя мовазнаўцы. Як горкае прызнанне гучаць словы М. К. Міцкевіча, сына народнага паэта Беларусі Якуба Коласа: “У нейкім сэнсе можна сказаць, што беларуская мова мёртвая. Усё залежыць ад таго асяроддзя, у якім мы знаходзімся штодня”.

У дачыненні да выкарыстання русізмаў найбольш паказальная сістэма інфармацыйных жанраў, непасрэдна звязаных з аператыўнасцю журналісцкага тэксту (нататкі ў штодзённых рубрыках “Розгалас”, “Абзац”, “Хроніка апошніх падзей”, рэпартажы, справаздачы і інш.). У гэтым бачацца дзве прычыны: першая – практычна ўсе грамадска-палітычныя падзеі асвятляюцца ў рускамоўным афармленні, другая – абмежаваны час ад падрыхтоўкі матэрыялаў да здачы газеты ў набор. Перад журналістам узнікаюць праблемы эквівалентнасці перакладу інфармацыйнага прадукту на беларускую мову, а перад стылістычнай і карэктарскай службамі – недахоп часу для якаснай вычыткі матэрыялаў. Акрамя таго, афіцыйныя паведамленні прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, інфармацыйнага агенцтва “БЕЛТА” таксама патрабуюць альбо перакладу, альбо своеасаблівай падгонкі да запланаванага раней аб’ёму на першай-другой паласе. Невыпадкова частка такіх матэрыялаў, напрыклад, можа суправаджацца спасылкай “Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь”.

Такім чынам, складваецца парадаксальная сітуацыя, пры якой беларуская мова, мова тытульнай нацыі, у газеце “Звязда” шмат у чым адлюстроўвае моўную сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь і сведчыць аб паступовым “прышчапленні” зусім неўласцівых моўных фактаў. Мова для журналістаў газеты ператвараецца ў рабочы інструмент, не з’яўляючыся жыццёвай неабходнасцю і вечным нацыянальным культурным феноменам, як адзначыла адна з чытачак, “беларусы адчуваюць сваю прыналежнасць да беларускага этнасу, аднак мова выступае толькі ў якасці этнічнага сімвала”.

23 кастрычніка 2016 г. на сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй А. Лукашэнка сказаў, што ў краіне існуе моўны дысбаланс не на карысць беларускай мовы, і прапанаваў падумаць аб стварэнні нацыянальнага ВНУ, дзе выкладанне вялося б толькі па-беларуску.

ЛІТАРАТУРА

1. Жолнерович, П. П. Русизмы на страницах белорусской газеты «Звязда» как отражение языковой ситуации / П. П. Жолнерович [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pandia.ru/text/78/145/8411.php. – Дата доступу: 12.04.2017.

2. Лукашанец, А. А. Двухмоўе / А. А. Лукашанец // Беларуская мова: Энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 174–176.

3. Одиноченко, В. Языковая ситуация в современной Белоруссии / В. Одиноченко [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://inosmi.ru/sngbaltia/20141124/ 224461486.html. – Дата доступу: 12.04.2017.

УДК 808.26(072)

– студэнтка

-

*Навуковы кіраўнік* – ***Селібірава Л. У.*** *– ст. выкладчык*
УА "Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія",
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Беларуская мова пастаянна ўзбагачае свой слоўнікавы склад запазычаннямі з іншых моў: нямецкай, польскай, рускай, англійскай, французскай і г. д. У апошні час адзінкі англійскага паходжання інтэнсіўна пранікаюць у сучасную беларускую тэрміналогію.

Вядома, што запазычванне лексікі – складаная з'ява, гэта не механічны працэс, не проста перамена асяроддзя для пэўнага слова. Запазычванне звязана з актыўнай перапрацоўкай як фанетычнага, так і марфалагічнага складу слова ў адпаведнасці з фанетычнымі і марфалагічнымі заканамернасцямі той мовы, якая запазычвае. Разам з тым у многіх словах адбываюцца розныя семантычныя зрухі. Англійская і беларуская мовы не блізкароднасныя. Фанетычная і марфалагічная сістэмы абедзвюх моў значна адрозніваюцца. Таму, пранікаючы ў беларускую мову, англіцызмы мусяць прыстасоўвацца да яе норм. Такім чынам, англійскія лексемы праходзяць фанетычную, марфалагічную і семантычную адаптацыю ў мове-рэцыпіенце.

***Фанетычная адаптацыя*** запазычанняў – гэта замена іншамоўных гукаў і спалучэнняў, не характэрных для беларускай мовы, спалучэннямі і гукамі, уласцівымі ёй. Фанетыка англійскай мовы значна адрозніваецца ад беларускай. Таму, зразумела, англіцызмы павінны набыць фанетычныя адметнасці мовы-рэцыпіента.

Англійскай мове ўласцівы доўгія і кароткія галосныя. Трапляючы ў беларускую мову, англіцызмы страчваюць доўгія гукі, адбываецца замена іх звычайнымі гукамі, уласцівымі беларускай мове: *iceber[Y]g → айсберг; bee[i:]fsteaks → біфштэкс; brie[i:]fing → брыфінг; bloo[u:]m → блюм; medicineba[o:]ll → медыцынбол* і інш.

Асноўнай рысай англійскіх галосных гукаў з'яўляецца іх падзел на манафтонгі, дыфтонгі і трыфтонгі. Дыфтонгі і трыфтонгі адсутнічаюць у фанетыцы беларускай мовы. Таму адбываецца адаптацыя англійскіх дыфтонгаў у беларускай мове. Спалучэнне англійскай асновы, якая заканчваецца на ***-er***, у беларускай мове на пісьме перадаецца праз:

1) ***ер*** – [эр]: *server → сервер; scanner → сканер; sniper → снайпер* і інш.; 2) ***ар*** – [ар]: *teetester → тытэстар; stopper → стопар* і г. д. Спалучэнне англійскіх літар ***-or*** абазначаецца ў беларускай мове праз ***-ар***: *sponsor → спонсар; stator → статар; transistor → транзістар.*

Для фанетыкі беларускай мовы характэрны такі фанетычны закон, як аглушэнне канцавых зычных. Гэты закон выяўляецца ў наступных тэрмінах-англіцызмах (пры вымаўленні, што перадаецца і на пісьме): *аўтборт (outboard); стандарт (standard); канкорс (concours[z]e)* і г. д. У іншых выпадках аглушэнне канцавых звонкіх зычных пісьмова не перадаецца: *джаз (jazz); скейтборд (skateboard); лорд (lord)* і г. д.

Так, тэрмінаадзінкі-англіцызмы інтэнсіўна прыстасоўваюцца да фанетычнай сістэмы беларускай мовы: а) тыповыя іншамоўныя англійскія гукі замяняюцца ўласнабеларускімі гукамі або спалучэннем гукаў, што ў шэрагу выпадкаў спрашчае вымаўленне англіцызмаў у беларускай мове; б) актыўна рэалізуюцца беларускія фанетычныя з'явы аканне, дзеканне, цеканне, аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова.

Аднак шэраг англіцызмаў, што замацаваліся ў слоўнікавым складзе беларускай мовы, патрабуе больш дасканалай адаптацыі, асабліва ў іх пісьмовым аблічны. Так, некаторыя з англіцызмаў захоўваюць спалучэнне ***тс***, што характэрна для рускай мовы *(яхтс[тс]мен, рэкардс[тс]мен).* Некаторыя навукоўцы прапануюць перадаваць англійскае спалучэнне *ts* у беларускай мове літарай *ц*, што значна спрасціла б вымаўленне гэтых адзінак.

***Марфалагічная адаптацыя*** выражаецца ў падпарадкаванні запазычанняў граматычнай сістэме беларускай мовы. Пранікаючы ў мову-рэцыпіент, англіцызмы падпарадкоўваюцца марфалагічным нормам сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Найбольшую колькасць запазычаных тэрмінаў складаюць назоўнікі. Назоўнікі англійскага паходжання набываюць граматычныя катэгорыі ліку, роду, склону. Значная частка англіцызмаў ужываецца ў форме як адзіночнага, так і множнага ліку (*акваланг, лайнер, панк, брэйн-рынг, імпічмент* і інш.). Вылучаецца і група англіцызмаў, якім уласцівая толькі форма адзіночнага ліку: *абеліт, адамсіт, нейлон, аўрал, байкот, байранізм, гаймарыт, дальтанізм.* У беларускай літаратурнай мове замацаваліся таксама назоўнікі-англіцызмы, якія маюць форму толькі множнага ліку: *аўтакары, беркшыры, масліны, хіпі, чыксы, шайры, эндсы* і інш.

У сучаснай англійскай мове класіфікацыя назоўнікаў паводле роду заснавана не на граматычных, а на семантычных і культурна-гістарыч-

ных прынцыпах. Тэрміны-англіцызмы, пранікаючы ў сучасную беларускую мову, змяняюцца паводле роду ў залежнасці ад семантычных або марфалагічных адзнак.

У сучаснай англійскай мове назоўнікам уласцівы 2 склоны: агульны (Common Case) і прыналежны (Possessive Case). Назоўнікі англійскага паходжання, трапляючы ў беларускую мову, змяняюцца па 6 склонах, як і беларускія словы.

Акрамя назоўнікаў, у сучаснай беларускай мове ёсць прыметнікі і дзеясловы англійскага паходжання: *варыабельны (ад англ. variable), камфартабельны (ад англ. comfortable), планарны (ад англ. planar), ацылаваць (acyl), трэніраваць (train), скaніраваць (scan)* і г. д.

У англійскай мове прыметнікі не змяняюцца па родах, ліках і склонах, у беларускай мове – змяняюцца. Так, у англійскай мове – *planar technology*; у беларускай – *планарная тэхналогія, планарнай тэхналогіі* і г. д. Англійскія дзеясловы таксама прыстасоўваюцца да граматычнай сістэмы беларускай мовы (беларускія суфіксы ***-ава-(-ява-), -ірава-***, катэгорыя роду ў прошлым часе).

Як паказваюць прыклады, англіцызмы актыўна адаптуюцца да марфалагічнай сістэмы беларускай мовы.

***Семантычная адаптацыя*** – найвышэйшая ступень адаптацыі запазычанняў у мове-рэцыпіенце, якая сведчыць пра ўключэнне іншамоўных адзінак у слоўнікавы склад сучаснай беларускай мовы, пра іх магчымасць выконваць камунікацыйную функцыю разам з уласнабеларускімі словамі. У новым моўным асяроддзі адзінка іншамоўнага паходжання прыстасоўваецца да лексічнай сістэмы мовы. Запазычанае слова можа страчваць сваю мнагазначнасць і замацоўвацца ў адным спецыфічным значэнні або з часам набыць некалькі новых значэнняў. Таму семантычная адаптацыя – паступовы працэс, які можа адбывацца доўгі час.

Такім чынам, у сучаснай беларускай мове адбываецца актыўнае фанетычнае, марфалагічнае і семантычнае засваенне тэрмінаадзінак-англіцызмаў розных часцін мовы (назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў).

ЛІТАРАТУРА

1. Антанюк, Л. А. Беларуская навуковая тэрміналогія. Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне / Л. А. Антанюк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 240 с.

УДК 808.26(072)
. – студэнтка

*Навуковы кіраўнік* – ***Малько Г. І.*** – *канд. філал. навук, дацэнт*
УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія»,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Навука тапаніміка дае нам адказ на пытанні, адкуль пайшла тая ці іншая назва вёскі, пасёлка, ракі, возера, урочышча і г. д.

На тэрыторыі, якую займаюць беларусы, выяўлены тапанімічныя назвы самых розных гістарычных перыядаў: даславянскага, агульнаўсходнеславянскага, уласнабеларускага.Аднак існуе яшчэ і народная этымалогія паходжання тапанімічных назваў – легенды, якія ўзніклі даўно, перадаваліся з пакалення ў пакаленне і дайшлі да нашага часу.

Назва вёскі *Багатырэвічы* звязана са словамі “багатыр”, “асілак”. Даўным-даўно ў наднямонскі край прыйшлі двое: Ян з простых людзей, Цэцылія – са знатнага роду. Ён сек дровы, яна збірала арэхі і дзікія яблыкі. Яны моцна кахалі адно аднаго і былі шчаслівыя. Шэсць сыноў і дачок было ў іх. Мінуў час. Нехта данёс літоўскаму князю аб уцекачах, і ён прыехаў са світай паглядзець на іх. Ян і Цэцылія, якім было ўжо па сто гадоў, разам з сынамі, дочкамі, унукамі і праўнукамі выйшлі з хаты. Князь быў здзіўлены іх сілай і прыгажосцю.

І вось за тое, што здолелі яны адваяваць у пушчы і дзікіх звяроў гэту зямлю, ператварыць берагавы наднямонскі лес ва ўрадлівае поле, сталі іх называць людзі багатырамі. Адсюль і пайшла назва вёскі.

Вёска *Варанілаўцы* афіцыйна называецца Варанілавічы. Па апавяданнях старажылаў, калісьці ў гэтых месцах быў дрымучы лес, што зліваўся з Белавежскай пушчай. У тутэйшых лясах хаваўся з атрадам атаман Ніл. Улады называлі яго злодзеем, як і ўсіх, хто выступаў супраць паноў. Пазней, калі Ніл загінуў, яго атрад стаў рассяляцца па вёсках. Нейкая частка былых нілаўцаў пасялілася ў глухім месцы, на беразе рэчкі Паплаўкі, і забудавалі яны невялікую вёсачку. Пасля яе назвалі Нілаўцы-Вары, а яшчэ пазней – Вара-Нілаўцы.

Прыблізна ў 70-х гг. ХІХ ст. граф Тышкевіч выпісаў сваёй сям’і з Аўстрыі мадзьяра-лекара. Доктар, пачаўшы практыку ў графскім маёнтку, у хуткім часе стаў вядомы пад імем Ферэнц. Доўгі час ён быў адзіны на ўсю акругу ўрач. Яго вядомасць, папулярнасць раслі з кожным годам. Да лекара прыходзілі, прыязджалі адусюль. Таму, хто

цяжка захварэў, звычайна раілі: “Ты б да Ферэнца схадзіў”. Да Ферэнца ішлі і ехалі па лекі, па параду. Так узнікла назва *Дафарэнцыя*.

Тутэйшыя людзі лічаць: вёска іх завецца *Камень* не таму, што вакол яе некалі “раслі” камяні. Імя сваё вёска атрымала ад валуна-волата (яго называюць “возам”), паблізу ад якога і пачала будавацца. Здарылася гэта ў даўніну. Вёз селянін воз сена з пушчы. Конік быў слабы, а, падымаючыся на гару, і зусім змогся. Колькі ні паганяў яго гаспадар – ні з месца. Пачаў пугай хвастаць ды яшчэ праклінаць-прыгаворваць:

– А каб ты, воўчы недаедак, у камень ператварыўся!

Так яно і здарылася. Конь ператварыўся ў камень.

Там, дзе цяпер вёска *Князева*, раней толькі сажалка была. Вакол сажалкі раслі дубы, таполі, ясені. А вёрст пятнаццаць адсюль жыў князь. Аднойчы ўвечары каля сажалкі з’явіліся цыганскія шатры. Сярод цыганоў была маладая цыганка. На плячы ў яе сядзела варона. Дачуўся князь, што надта харошая цыганка з’явілася ў гэтых краях. І ноччу князь украў яе.

Кахаў гэтую цыганку малады прыгожы цыган. Узяў ён двух цыганоў і неяк на наступную ноч вызваліў сваю каханую. Пачалі цыганы збіраць свае шатры, ды не паспелі. Прыехаў князь са сваімі служкамі. Пачаўся бой. Людзей у князя было больш, і яны хутка расправіліся з цыганамі. Забілі і маладога цыгана. Як убачыла цыганка свайго мілага – ужо забітага, – схапіла сякеру, падкралася ззаду да князя і забіла яго адным ударам. А сама ўскочыла на каня і памчалася ў лес. А князя пахавалі. Потым на гэтым месцы пачалі будавацца людзі.

Доўгі час адну сялібу называлі Лебедзева Дно. Быццам бы ў далёкія часы на месцы сяла Лебедзева, між пагоркаў, разлілося вялікае возера. Людзі, што жылі на яго прыгожых берагах, лавілі ў возеры рыбу, палявалі на качак, касілі на лугах буйныя травы.

Выцякала з возера рачулка Нявежа, невялікая, але глыбокая, паўнаводная, а на яе берагах стаялі багатыя вёскі ды хутары. Называлася возера Лебедзевым, таму што пасярэдзіне яго, на востраве, здаўна жылі лебедзі. Але нават самыя зацятыя паляўнічыя не чапалі, не палохалі гордых птушак. Усе ведалі: гэта яны, лебедзі, ахоўваюць возера, таемна ад людзей будуюць і рамантуюць схаваныя пад вадою плаціны і дамбы. Таму возера і трымаецца між пагоркаў.

Толькі знайшоўся злы чалавек. Падплыў аднойчы да вострава і застрэліў самага вялікага лебедзя-важака. Пакінулі лебедзі возера. А праз год ці два прагнілі схаваныя ў чароце і пад вадой лебядзіныя дамбы. За тры дні вада назаўсёды выцекла з катлавіны-чашы, сплыла ў

вялікую раку. Па берагах Нявежы пазносіла хаты, змыла з палеткаў ураджай, патапіла жывёлу.

Прайшоў час, людзі забыліся на тую бяду і пачалі зноў сяліцца ў зручным зацішку, на дне былога Лебядзінага возера. Таму новую сялібу і называлі спачатку Лебедзевым Дном, а пазней – *Лебедзева*.

У дарэвалюцыйныя гады была вёска *Халуі*. Яшчэ за прыгонам нейкі багаты пан выселіў на пустэльны бераг Свіслачы тры сям’і непакорных сялян і загадаў ім не зямлю араць, а абслугоўваць панскіх гасцей, што з’язджаліся да ракі, на луг, бляваць.Звалі тых людзей, магчыма, за іх горды характар, саколкі, а месца, дзе яны пабудаваліся ў хуткім часе, пачалі называць *Сакаліны Кут*.

Ды толькі не падабалася гэта пану, палохала яго. І загадаў ён пад страхам лютай кары называць Сакаліны Кут *Халуямі*. “Каб не забываліся, што не сокалы вы, а чорныя мужыкі-парабкі, халуі. Абавязаныя прыслугоўваць гасцям маім”. А новую сваю назву – *Ліпень* – вёска атрымала неўзабаве пасля вызвалення раёна ад белапалякаў. Адбылося гэта якраз у сярэдзіне лета – у ліпені, калі шчодра цвілі духмяныя ліпы. Вось адкуль у вёскі гэтае пяшчотнае, напеўнае імя – Ліпень.

А вось гісторыя назвы вёскі *Салтаны*. У вайне з туркамі перамаглі рускія. Частку туркаў завезлі ў Расію, ім было дазволена жыць у вёсках і гарадах, займацца рамяством. Аднойчы на багаты хутар прыблудзіў адпушчаны на волю малады турак. Наняў яго гаспадар на касьбу, а потым, убачыўшы, што хлопец ён спраўны, працавіты, пакінуў у работніках на ўвесь год. Звалі таго прыгожага вясёлага хлопца Салтан. Ён стаў гаспадаром у вёсцы. Адсюль назва.

Легенды пра паходжанне беларускіх гарадоў і вёсак даюць вельмі цікавы матэрыял, з якога мы даведваемся пра тое, адкуль узнікла тая ці іншая назва паселішча, з чым яна звязана. Хоць легенды – гэта не навуковае тлумачэнне паходжання тапанімічных назваў, але яны выклікаюць у чытачоў вялікую цікавасць да нашай гісторыі, мовы, пачуццё павагі да нашых продкаў, якія стварылі гэтыя легенды, што дайшлі да нас з далёкіх часоў.

ЛІТАРАТУРА

1. Бяздоннае багацце: Легенды, паданні, сказы / склад. А. І. Гурскі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990.

УДК 336.225.2:631.157

– студэнт
**І**
*Навуковы кіраўнік –* ***Скікевіч Т. І.*** *– канд. філал. навук, дацэнт*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

З пачатку свайго існавання чалавецтва не валодала ні адным з сучасных відаў пісьменства. Таму было дастаткова цяжка перадаваць информацыю на вялікія адлегласці пры немагчымасці асабістай сустрэчы. Пацвярджэннем гэтаму служыць легенда аб персідскім цару Дарыю. Згодна з ёй, цар атрымаў ліст з чатырох прадметаў: птушкі, мышы, жабы і стралы. Як растлумачыць пасланне, ніхто не ведаў. Аднак у канцы вайны з ворагам усе зразумелі, што пасланне было папярэджаннем аб паражэнні ў вайне.

Пасля гэтага людзі зразумелі, што ў такіх пасланнях ёсць сэнс, і пачалі вынаходзіць розныя варыянты перадачы інфармацыі. Спачатку гэта былі прымітыўныя надпісы на розных прадметах той эпохі, гліняныя таблічкі, посуд, сцены і гэтак далей. Адмысловае развіццё пісьменнасць атрымала ў Егіпце. Там быў вынайдзены папірус, на якім было зручна пісаць пасланні. У іншых краінах археолагі знаходзяць цэлыя бібліятэкі.

На працягу стагоддзяў пісьменнасць зрабіла вялікі крок на шляху да прагрэсу. Напэўна, самая важная падзея адбылася ў IX ст. Менавіта тады братамі Кірылам і Мяфодзіем былі створаны дзве шмат у чым падобныя славянскія азбукі, якія называліся кірыліца і глаголіца. Першая з іх больш старажытная і была створана славянскім асветнікам Кірылам. Другой, не менш важнай, з’яўлялася глаголіца. Алфавітны парадак літар і спосабы ўтварэння яе знакаў мала чым адрозніваліся ад кірылічнай азбукі. Асаблівасцю глаголіцы з’яўляецца рэдкае ўжыванне лінейных элементаў, наўзамен ужывання акружнасцяў. Але гэтая асаблівасць не дазваляе звязаць гэтую азбуку з іншымі таго ж часу. Пасля гэтага кірыліца і глаголіца пранікклі ў Старажытную Русь. З дзясятага стагоддзя яны толькі пачыналі распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі, а ў XII ст. у беларускай літаратуры з’явіўся новы падраздзел пісьменства – летапісанне. Пераважна ён уключаў у сябе аўтабіяграфічныя апавяданні, якія апісвалі жыццё і побыт, што вылучаюць асоб таго часу, а таксама ў іх падрабязна адлюстроўваліся многія гістарычныя падзеі. Найбольш яркімі летапіснымі творамі з’яўляюцца «Аповесць мінулых гадоў» і «Слова пра паход Ігараў».

З першай паловы XIII ст. пачала фарміравацца ўласна беларуская пісьменнасць. На базе гутарковай мовы з'яўляліся пісьмовыя помнікі з першымі характэрнымі прыкметамі старабеларускай мовы. Яна выкарыстоўвалася пры напісанні Статутаў ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. Таксама працягвалася напісанне новых летапісаў, такіх, як "Хроніка Быхаўца", "Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх" і інш.

Важную ролю ў развіцці пісьменства, кніжнасці, адукацыі і ўсёй айчыннай культуры адыгрывалі манастыры. Гэта былі свайго роду храмы культуры, якія выконвалі не толькі культавую, але і адукацыйна-асветніцкую функцыю дзякуючы ўдзелу ў агульнай духоўнай працы, разам з манахамі і святарамі, аўтарытэтных свецкіх дзеячаў. Вялікі ўклад у развіццё культуры і пісьменства зрабіў Францыск Скарына. Ураджэнец Полацка, доктар медыцынскіх навук, ён з'яўляецца першым кнігадрукаром і перакладчыкам кніг на тэрыторыі Беларусі. Найбольш знакамітымі яго працамі сталі пераклад Біблii на старабеларускую мову, творы "Апостал", "Прытчы Саламона" і "Песня песень".

У XVII ст. беларуская літаратура пачынае рэгрэсаваць, і гэта звязана з паступовай паланізацыяй беларускага насельніцтва, мэтай якой было замацаванне тэрыторыі Беларусі за Рэччу Паспалітай. Аднак ужо ў пачатку XIX ст., пасля распаду Рэчы Паспалітай, беларуская пісьменнасць аднавіла сваё развіццё. У гэты час былі напісаны паэмы "Пан Тадэвуш" Адама Міцкевіча, "Энеіда навыварат" Вікенція Равінскага і "Тарас на Парнасе" Канстанціна Вераніцына.

У пачатку XX ст. уплыў на беларускую літаратуру аказвалі газеты, бо многія знакамітыя творы друкаваліся менавіта ў іх. Дзякуючы працы газет «Наша ніва», часопіса «Маладняк» адбывалася папулярызацыя беларускага пісьменства. Найбольш частая тэма твораў тых гадоў – тэма вайны. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны беларуская пісьменнасць паступова пачынае прыгнятацца савецкімі ўладамі, праз што яе развіццё было запаволена.

На аснове праведзенага даследавання можна сказаць, што на беларускіх землях у IX–XV стст. разам са станаўленнем дзяржаўнасці развіваліся пісьменнасць і кніжнасць. У гэты перыяд сфарміраваліся асноўныя асаблівасці старабеларускай мовы, якая стала дзяржаўнай у Вялікім Княстве Літоўскім. Узніклі помнікі пісьменства, з'явіліся буйныя дзеячы літаратуры, якія зрабілі шмат для станаўлення айчыннай культуры. Станоўчы ўплыў на развіццё і распаўсюджванне пісьменнасці аказалі хрысціянства, праваслаўныя і каталіцкія храмы і

манастыры. Расла роля гарадоў як цэнтраў дэмакратычнай культуры. Такім чынам, пісьменнасць на Беларусі прайшла доўгі шлях ад з’яўлення на яе зямлі кірыліцы і да сённяшніх дзён.

ЛІТАРАТУРА


1. Развіццё пісьменства ў Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://vseuznaem.su/razvitie-pismennosti-v-belarusi. – Дата доступу: 26.03.2017.

2. Старажытная беларуская пісьменнасць і літаратура [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.culturemass.ru/lemas-956-1.html. – Дата доступу: 26.03.2017.

3. Пісьменнасць [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://izobretaika.in.ua/istory-izobreteniy/pismennost/. – Дата доступу: 26.03.2017.



УДК 811.161.1



– студентка

«

*Научный руководитель –* ***Добижи С. П.*** *– ст. преподаватель*

УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия», Горки, Республика Беларусь


Тюркизмы занимают значительное место в лексике современного русского языка. Тюркизмы – лексические единицы, заимствованные русским языком из тюркских языков.

В течение многих веков тюркские народы жили по соседству с русским народом, поэтому вхождение тюркской лексики в русскую речь обусловлено как лингвистическими факторами (языковые контакты в двуязычной среде), так и экстралингвистическими (развитие торговли; расширение торговых, военных, дипломатических и культурных связей). Основная масса тюркских заимствований приходится на период XVI–XVII вв.

Для всех тюркских заимствований характерен сингармонизм гласных – фонетическая особенность, которая заключается в повторении одной и той же гласной в слове: *башмак, алмаз, казна, батрак, сазан, таракан, баклажан, балаган; сундук, урюк, утюг, чубук, чугун*. Кроме того, для некоторых слов тюркского происхождения характерны конечные элементы *-**лык*** и *-**ча***: *башлык, ярлык, балык, шашлык; каланча, алыча, парча, саранча, епанча*.

Используя вышеназванные особенности тюркских заимствований, мы выделили в «Словаре живого великорусского языка» В. И. Даля 90 тюркизмов и разделили их на 10 тематических групп:

1) названия родственных и семейных отношений: *аксакал, кунак, ага, апайка, ата* и др.; 2) обычаи, традиции: *калым, джигитовка, пешкеш, баранта, бакшиш* и др.; 3) мифология, религия: *зилан, шайтан, намаз, аман, байрам, Коран, мечеть, минарет* и др.; 4) строительство, постройки: *сарай, аул, юрта, улус, сераль, балаган* и др.; 5) административно-экономические слова: *сара, закят, батман, тамга, байгуш, султан, юрт, орда, казна, аманат, базар, бирка, палач* и др.; 6) еда и напитки: *кумыс, айран, урюк, хурма, каймак, калач, тузлук, махан* и др.; 7) одежда: *шаровары, халат, тюбетейка, султан, чекмень, малахай, чапан, чалма, туманы, азям, чадра, башмак, бешмет* и др.; 8) ткани: *кошма, войлок, бязь, атлас*; 9) лексика, связанная с животноводством: *аркан, курдюк, нагайка, табун, тавро, баран*; 10) слова, обозначающие перемещения в пространстве: *караван, кочевка; транспорт: тарантас, арба*.

В зависимости от причины заимствования и степени семантического освоения русским языком выделяют три следующие группы тюркизмов.

Первая группа включает тюркизмы, которые пришли в лексику русского языка вместе с новыми предметами, понятиями, значениями, появившимися благодаря общению с тюркскими народами. Их употребление в языке обусловлено необходимостью дать наименование новому явлению действительности. Из выделенных нами слов к данной группе можем отнести следующие: *кумыс, караван, парча, кошма, урюк, войлок, бязь, калач, тарантас.*

Вторая группа включает слова тюркской заимствованной лексики, вошедшие в русский язык в качестве новых наименований уже известных предметов, понятий и явлений. Сюда отнесем такие слова: *каймак (сливки), ябага (руно), ата (отец), тузлук (рассол), саксак (овчина), сундук (короб), айран (простокваша), калым (кладка), тамга (клеймо), сарай (амбар), аркан (веревка), пешкеш (гостинец), чапан (кафтан).*

Третья группа включает экзотизмы – слова, связанные с обозначением своеобразия быта и нравов того или иного народа, той или иной страны. Например, *тюбетейка, шаровары, халат, баранта, малахай, бешбармак, чалма, гарем, байгуш, намаз.*

Тюркизмы, выделенные в «Толковом словаре живого великорусского языка» В. И. Даля, в подавляющем большинстве относятся к бытовой сфере употребления, они однозначны, обозначают конкретные бытовые реалии, но широко используются и в настоящее время, например, *айран* – разболтанная на воде простокваша для питья; *са-*

*ра* – деньги; *байгуш* – нищий из кочевых инородцев; *барханы* – холмистые степные пески; *бешбармак* – мясное блюдо и т. д.

ЛИТЕРАТУРА

1. Даль, В. И. Толковый словарь живого великорусского языка. Т. 1. А – З: / В. И. Даль; ред. К. В. Виноградова; А. М. Бабкин и др. – Печ-ся по изд. 1955 г. (1880–82). – М.: Русский язык, 1998. – 700 с.

2. Даль, В. И. Толковый словарь живого великорусского языка. Т. 2. И – О / В. И. Даль; ред. К. В. Виноградова. – Печ-ся по изд. 1955 г. (1880–82). – М.: Русский язык, 1998. – 780 с.

3. Даль, В. И. Толковый словарь живого великорусского языка. Т. 3. П / В. И. Даль; ред. К. В. Виноградова. – Печ-ся по изд. 1955 г. (1880–82). – М.: Русский язык, 1998. – 556 с.

4. Даль, В. И. Толковый словарь живого великорусского языка. Т. 4. Р – У / В. И. Даль; ред. К. В. Виноградова. – Печ-ся по изд. 1955 г. (1880–82). – М.: Русский язык, 1998. – 684 с.

5. Крысин, Л. П. Русское слово, свое и чужое: Исследования по современному русскому языку и социолингвистике / Л. П. Крысин. – М.: Наука, 2004. – 888 с.

6. Орешкина, М. В. Тюркские слова в современном русском языке / М. В. Орешкина. – М.: Наука, 1994. – 80 с.

УДК 808.26(072)

– студэнткі

*Навуковы кіраўнік* – ***Селібірава Л. У.*** *– ст. выкладчык*
УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

Кірыліца – старажытная славянская азбука. Назва паходзіць ад імені славянскага асветніка Канстанціна (Кірылы) Філосафа. Верагодна, кірылічнае пісьмо распрацоўвалі і распаўсюджвалі паслядоўнікі Кірылы і Мяфодзія, а не самі Кірыл і Мяфодзій, таму такая назва пісьменнасці хутчэй аддае даніну павагі, чым абазначае аўтарства.

У беларускай, рускай, балгарскай, македонскай і сербскай мовах кірыліца таксама вядома пад назвай “азбука”, што паходзіць ад старой назвы дзвюх першых літар кірылічнага алфавіта (гэтак жа, як і слова *алфавіт* пайшло ад першых дзвюх грэчаскіх літар (*альфа* і *бета*).

Мяркуюць, што кірылічнае пісьмо створана ў сярэдзіне IX ст. на аснове глаголіцы і грэчаска-візантыйскага ўстаўнога пісьма.

Каля 863 г. браты Канстанцін (Кірыл) Філосаф і Мяфодзій з Салуні па загадзе візантыйскага імператара Міхаіла III упарадкавалі пісьмен-

насць для стараславянскай мовы і выкарыстоўвалі новую азбуку для перакладу на славянскую мову грэчаскіх рэлігійных тэкстаў.

Доўгі час дыскусійным заставалася пытанне, ці была гэта кірыліца (і ў такім выпадку глаголіцу лічаць тайнапісам, які з’явіўся пасля забароны кірыліцы). Можа, гэта была глаголіца? Цяпер у навуцы пераважае погляд, згодна з якім глаголіца першасная, а кірыліца другасная (у кірыліцы глагалічныя літары заменены на вядомыя грэчаскія). Глаголіца доўгі час у некалькі зменены выглядзе ўжывалася ў харватаў (да XVII ст.).

З’яўленне кірыліцы, заснаванай на грэчаскім статутным (урачыстым) пісьме, звязваюць з дзейнасцю балгарскай школы кніжнікаў (пасля Кірылы і Мяфодзія). У прыватнасці, у жыціі святога Клімента Охрыдскага пішацца аб стварэнні ім славянскага пісьменства ўжо пасля Кірылы і Мяфодзія. Дзякуючы папярэдняй дзейнасці братоў азбука атрымала шырокае распаўсюджванне ў паўднёваславянскіх землях, што прывяло ў 885 г. да забароны кірыліцы ў царкоўнай службе Папам Рымскім, які змагаўся з вынікамі місіі Канстанціна-Кірылы і Мяфодзія.

У Балгарыі цар Барыс у 860 г. прыняў хрысціянства. Балгарыя становіцца цэнтрам распаўсюджвання славянскага пісьменства. Тут ствараецца першая славянская кніжная школа – Праслаўская кніжная школа; перапісваюцца кірыла-мяфодзіеўскія арыгіналы богаслужэбных кніг, робяцца новыя славянскія пераклады з грэчаскай мовы, з’яўляюцца арыгінальныя творы на стараславянскай мове.

Шырокае распаўсюджванне славянскага пісьменства адносіцца да часу валадарання ў Балгарыі цара Сімяона Вялікага (893–927 гг.), сына цара Барыса. Пазней стараславянская мова пранікае ў Сербію, а ў канцы X ст. становіцца мовай царквы ў старажытнарускай дзяржаве.

Першапачаткова кірыліцай карысталіся частка паўднёвых славян, усходнія славяне, а таксама румыны; з часам іх алфавіты некалькі сталі адрозніваца адзін ад аднаго, хаця напісанне літар і прынцыпы арфаграфіі заставаліся (за выключэннем заходнесербскага варыянта) у цэлым агульнымі.

Найстаражытнейшыя помнікі кірыліцы: надпісы на руінах царквы ў Праславе (9 ст., Балгарыя), на гліняным посудзе з раскопак пад Смаленскам (пач. 10 ст.), балгарскі надпіс у Дабруджы (943 г.), берасцяныя граматы (10–15 ст.), Савава кніга і Супрасльскі рукапіс (11 ст.), першы датаваны рукапіс – Астрамірава Евангелле (1056–1057 гг.).

Першай друкаванай кнігай, набранай кірылічным шрыфтам, была кніга Феола «Актоіх», у 1491 г. выдадзеная ў Кракаве.

Другі ўзор кірылічнага пісьма – кніга «Апостал» Ф. Скарыны. Тут упершыню з’явіўся тытульны ліст, малыя і вялікія літары (выдзяленні ў тэксце набіраліся вялікімі літарамі).

Склад першапачатковай кірылічнай азбукі нам невядомы. «Класічная» стараславянская кірыліца складаецца з 43 літар. Кірыліца цалкам уключае грэчаскі алфавіт (24 літары) і 19 літар для абазначэння гукаў, спецыфічных для славянскай мовы (гэтыя літары адсутнічаюць у грэчаскай мове). 27 літар мелі лікавае значэнне.

Да рэформы Пятра І малых літар у азбуцы кірыліцы не было, увесь тэкст пісалі вялікімі літарамі.

У 1708–1711 гг. Пётр І распачаў рэформу рускага пісьма, зняўшы надрадковы знак, скасаваўшы некалькі літар і ўзаконіўшы іншае (набліжанае да лацінскага шрыфту таго часу) напісанне пакінутых літар – так званы грамадзянскі шрыфт. Былі ўведзены малыя варыянты кожнай літары, уведзены літары Я і Э.

Неўзабаве на грамадзянскі шрыфт (з адпаведнымі зменамі) перайшлі сербы, пазней – балгары; румыны ж у 1860-я гг. адмовіліся ад кірыліцы на карысць лацінскага пісьма (што цікава, у іх пэўны час выкарыстоўваўся “пераходны” алфавіт, які ўяўляў сабой сумесь лацінскіх і кірылічных літар). Грамадзянскім шрыфтам з мінімальнымі зменамі напісання мы карыстаемся і дагэтуль.

На сённяшні дзень у якасці афіцыйнага алфавіту кірыліца выкарыстоўваецца ў наступных краінах: Беларусь, Боснія і Герцагавіна, Балгарыя, Македонія, Расія, Сербія, Украіна, Чарнагорыя, Абхазія, Казахстан, Кіргізія, Манголія, Прыднястроўе, Таджыкістан, Паўднёвая Асецiя.

Кірылічны алфавіт неславянскіх моў быў заменены лацінкай у 1990-я г., але да гэтага часу выкарыстоўваецца неафіцыйна як другі алфавіт у Туркменістане і Узбекістане.

Кірыліца абслугоўвае 50 моў, з’яўляецца 4-й па сваім распаўсюджванні ў свеце (пасля лацінскай, кітайскай і арабскай).

Такім чынам, прыняцце кірылічнага пісьма аказала ўплыў на развіццё літаратурна-пісьмовай мовы паўднёвых (балгары, сербы, харваты), заходніх (чэхі, славакі) славян і, вядома ж, Старажытнай Русі. Пазней кірыліца легла ў аснову рускай, украінскай і беларускай моў. Несумненна, кірылічныя асновы адбіліся на польскай, сербалужыцкай, палабскай мовах.

Адна з галоўных прыцягальных рыс кірыліцы ў тым, што словы вымаўляюцца так, як яны напісаны. У старaславянскай і ў сучаснай рускай, беларускай мовах мы не сустрэнем такога разыходжання паміж гучаннем слоў і іх вымаўленнем, як, напрыклад, у англійскай або французскай. За гэта мы ўдзячныя вялікім асветнікам.

У гонар Кірылы і Мяфодзія кожны год святкуецца Дзень славянскага пісьменства. Гэта свята пачалі адзначаць у Балгарыі; з 1987 г. яно адзначаецца і ў нас, у Беларусі. Беларускі народ аддае даніну памяці і ўдзячнасці “славянскіх краін настаўнікам...”

ЛІТАРАТУРА

1. Каўрус, А. А. Славянскія азбукі, іх паходжанне / А. А. Каўрус, М. М. Круталевіч. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 75 с.

УДК 008(510)

– магистрантка

*Научный руководитель –* ***Добижи С. П.*** *– ст. преподаватель*
Северо-Восточный университет,
Шэньян, Китай

Понятие цифры и числа в китайской традиционной культуре сформировалось очень давно. С древних времен китайцы полагали, что цифра знаменует божественный и таинственный порядок, является волшебным ключом к пониманию космической гармонии.

В настоящее время в Китае цифры и числа воспринимаются не только как определённое количество каких-то предметов, но и как отражение богатой древней культуры китайского народа.

В Китае все любят чётные числа и считают, что чётное приносит счастье, а нечётное приносит плохое. Поэтому, например, при посещении больных покупают фрукты либо двух видов, либо четырех, обязательно чётное число. На праздничном столе всегда чётное число блюд.

Китайцы считают, что нечётное число предназначено только для умерших, поэтому во время праздника почитания предков на столе нечётное число блюд.

В традиционной китайской культуре даже конкретные числа ассоциируются с хорошим или плохим. Эмоциональная окраска каждого числа определяется в первую очередь по омофонам – словам, имеющим сходное звучание.

Широко известно, что китайцы избегают любых упоминаний числа четыре или его производных – сорок четыре, четырнадцать и т. д. Это объясняется тем, что по-китайски слова «смерть» (*sǐ*) и «четыре» (*sì*) звучат одинаково. Именно поэтому в Китае не любят номера квартир, машин или телефонов, где встречается несколько цифр «4». Бизнесмены обращают на это число особое внимание. В связи с этим иностранным партнёрам следует избегать заключать договоры с китайцами 4, 14 или 24 числа, особенно в апреле (4-й месяц). Не предлагайте китайскому партнеру четыре программы делового сотрудничества, соглашение из четырех пунктов, четыре базовых проекта и т. д.

Самым удачным и счастливым числом считается восемь. Это связано с тем, что произношение слова восемь *bā* похоже на слово *fā* – богатство, процветание, успех.

Китайцы оценят ваше знание традиции, если вы предложите им подписать соглашение именно 8-го числа в 20.00. Очень «правильной» ценой товара в Китае считается 8,88 или 88,88. Примечательно, что в течение очень долгого времени Банк Китая несколько искусственно поддерживал отношение доллара к юаню как 1 к 8 – возможно, именно это способствовало росту китайской экономики.

У числа шесть *liù* тоже есть специальные коннотации из-за его произношения. Слово *шесть* близко по звучанию со словом *liú* – «течь, протекать гладко». Поэтому шестерка рассматривается как благоприятное пожелание, чтобы все дела шли гладко, именно поэтому китайцы всегда сочетают числа шесть и восемь, когда устраивают свадьбу, открывают ресторан или начинают новое дело.

Число девять *jiǔ* – одно из самых сильных чисел в китайской традиции: оно, с точки зрения китайцев, обозначает максимум. Древние китайские мудрецы отмечали, что всё то, что превышает девять, равно нулю. Произношение слова *девять* совпадает с произношением слова *долгий, вечный*, поэтому числа *девять* и особенно *девяносто девять* соотносятся с чем-то очень устойчивым и успешным. До сих пор в некоторых китайских деревнях сохранилась традиция, связанная с верой в могущество числа девять: если преподносят в подарок деньги или платят выкуп за невесту, то дают сумму, кратную именно девяти.

Кроме того, начертание иероглифа девять похоже на изображение дракона, являющегося в Китае символом власти, могущества и полномочия, поэтому только император может использовать цифру девять.

Так, в древнем Китае на кресле императора изображён дракон, а на территории императорского дворца Гугун в Пекине сохранилась зна-

менитая стена девяти драконов. В настоящее время многие названия и логотипы фирм содержат в различных вариациях число девять как символ успеха и процветания.

Число два *èr* предполагает гармонию взаимоотношений, оно является продолжением фундаментальной бинарной оппозиции инь-ян.

Как видим, числа играют очень большую роль в жизни современного китайского общества.

СОДЕРЖАНИЕ

…………………………………………………………………………… 3

Проблема человека и общества в духовном наследии Ф. Скорины…………………………………………………………………………… 4
. . Фразеалагізмы на аснове біблейскіх легенд і сюжэтаў…………… 7
Адаптация первокурсников к условиям обучения в вузе и ее психологические особенности…………………………………………… 9
Интернет-зависимость в студенческой среде и ее профилактика……………………………………………………………… 11
Первые меценаты белорусского книгопечатания……………… 14
Беларусь и Польша – общее культурное пространство……………… 17

**1. -**

Спасо-Преображенский храм г. Шклова…………………………… 20
Мікалай Канстанцінавіч Судзілоўскі – першы і апошні энцыклапедыст XX стагоддзя…………………………………………………… 23
Ільянская гута як аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны………… 26
Маральна-этычныя погляды Францыска Скарыны…………………… 28
ў Філаматы як прадвеснікі беларускага Адраджэння…………… 31
. Международный фестиваль искусств «Славянский базар»: история и современность……………………………………………………… 34
Симеон Полоцкий как литературный деятель……………………… 37
. Искусство жизни Мая Данцига……………………………………… 40
Книги – дети разума……………………………………………… 42
Традыцыі беларускага кнігадрукавання……………………………… 45
Гордосць Беларуси – нобелевский лауреат Жорес Алфёров…… 47
Космос Бориса Кита……………………………………………… 50
Сюжеты Библии в культурной жизни человечества………………… 52
Захавальнік беларускага фальклору – Ян Чачот……………………… 56
. Николай Гусовский и его роль в белорусском Возрождении 59
История крепости на Березине…………………………………… 62
Притяжение слова Ф. Скорины…………………………………… 64
Гонар нацыі – Якуб Наркевіч-Ёдка……………………………… 67
. Статут ВКЛ 1588 г. як помнік юрыдычнай думкі……………….. 70
Типография братьев Мамоничей………………………………… 73
Выдатныя рэфарматары Гродна……………… 76
Некоторые аспекты становления белорусского книгопечатания XVI–XVII веков…………………………………………………… 78

-

Негативные стереотипы и новая модель неполной семьи………… 81
. Права и обязанности человека: национальное измерение проблем управления сообществами…………………… 83
Межкультурные барьеры и способы их преодоления в процессе коммуникации…………………………………………………………… 87

. . Формирование коммуникативной компетенции студентов в системе высшего образования………………………………………………… 90
Актуальность инновационных методик профориентации, развития образования и науки……………………………………………………… 93
Проблемы семьи и брака в современном белорусском обществе…… 96
Выдающиеся выпускники Падуанского университета………… 99
. Социальное неравенство в образовании в теории П. Бурдье……… 102
. Политика интернационализации высшего образования в Германии…………………………………………………………………… 105
Особенности процесса воспитания……………………………… 108
Факторы, определяющие социально-психологический климат в студенческом коллективе………………………………………………… 111
Использование новых технологий в образовании……………… 114
Система образования в Туркменистане и ее реформирование… 116
. Толерантность как феномен белорусского общества……………… 119
. Акмеологические характеристики профессионального образования 121
Влияние семьи на формирование личности……………………… 123
Использование аудиовизуального метода в учебном процессе……. 126
. Социализация студенческой молодежи в процессе обучения в УО БГСХА…………………………………………………………………… 129
Агрессивное поведение подростков в условиях современного общества…………………………………………………………………… 132
. Развитие управленческой культуры будущих специалистов АПК.. 134
Христианское отношение к браку……………………………… 137
Структура современной семьи в белорусском обществе……… 139
Библейские тексты в школьном курсе зарубежной литературы…. 143
Развитие дистанционного образования в Республике Беларусь…………………………………………………………………… 146
Особенности психического напряжения студентов в процессе обучения…………………………………………………………………… 149
Проблемы и перспективы модернизации системы высшего образования в Украине……………………………………………………… 152
Проблема девиантного поведения: ситуация в Беларуси……… 154
Возможности развития дистанционного образования в Беларуси…………………………………………………………………… 156
Противодействие экстремизму в белорусском обществе: роль воспитания и образования………………………………………… 158
Особенности адаптации студентов-первокурсников к условиям обучения в вузе……………………………………………………………… 160
Влияние СМИ на формирование личности подростка……………… 162
Роль образования в улучшении экономической ситуации в Беларуси…………………………………………………………………… 165
Роль Православной Церкви в развитии образования…………… 167
Семья как фактор социализации личности……………………… 170

**3.**

Китабы – книги белорусских татар…………………………………… 173
Таямніца імя беларускага……………………………………….. 175
. Гісторыя паходжання беларускіх імёнаў і прозвішчаў………….. 178

Паходжанне назваў беларускіх месяцаў……. 181
. Прыказкі вёскі Плотніца Столінскага раёна…………………………. 184
Новруз – древний и вечно юный праздник………………………… 186
Традиции и обычаи туркменского народа в прошлом
и настоящем…………………………………………………………………… 188
Праяўленне інтэрферэнцыі ў СМІ як вынік дзяржаўнага
білінгвізму……………………………………………………………………… 191
Адаптацыя тэрмінаадзінак-англіцызмаў у сучаснай
беларускай мове……………………………………………………………… 194
Назвы беларускіх вёсак у легендах………………………………… 197
Гісторыя стварэння пісьма…………………………………………… 200
Тюркизмы в «Толковом словаре живого великорусского
языка» В. И. Даля……………………………………………………………. 202
Гісторыя стварэння кірыліцы………………… 204
. Значения чисел в китайской культуре……………………………… 207